Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Арган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (б) Беларусі.

ГОД ВЫДОЕНЬНЯ—XV
№ 13 (3917)
СЕРАДА, 14 СТУДЗЕНЯ
1931 г.

Цана нумару 5 коп.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

Увесьці ў бой жаночыя рэзэрвы

Шпарні тэмп сацыялістычнага будаўніцтва і разгорнутае наступленьне на капіталістычныя элементы ў нашай краіне, якія зьявіліся вынікам няўхільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, прывёў ужо ў палове другога году пяцігодкі ня толькі да зьмякчэньня, але да ліквідацыі, у асноўным, беспрацоўя.

У сучасны момант адным з сур'ёзных пытаньняў далейшага разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва зьяўляецца пытаньне аб крыніцах рабочай сілы, асабліва аб падрыхтоўцы кваліфікаванай рабочай сілы ў галіне гаспадаркі, дзяржаўнага будаўніцтва і культуры. Праблема кадраў зьяўляецца вузлавой праблемай сацыялістычнага будаўніцтва. У гэтых умовах роля і значэньне жаночыны-работніцы вырастае ў вялізарнай ступені.

У сучасны момант у прамысловасьці жаночыны складаюць каля 36 проц. агульнае колькасьці рабочых і ў бягучым годзе іх удзельная вага павінна ўзрасьці да 50 проц. На культурным фронце роля жаночыны зьяўляецца яшчэ больш значнай. Ня меншае значэньне мае работа жаночын у дзяржаўным апараце.

Асабліва трэба гаварыць аб ролі жаночыны ў калгасным будаўніцтве. Тут жаночына зьяўляецца вельмі часта тармозячым элементам, бо кансэрватым і зацкаўленасьцьцю маюць сярод жаночын-бяднячак і сераднячак асабліва спрыяючую глебу. Неабходна, аднак, падкрэсьліць, што, калі сялянка-бяднячка або сераднячка ўпэўніваецца ў карысьці калектыўнае працы, тады яна зьяўляецца магутным штурхачом калгаснага будаўніцтва наогул і арганізацыі працы ў калгасах ў прыватнасьці.

Недаацэнка, а часта пагардлівыя адносіны да работы сярод жаночын, недаацэнка тэй крыніцы папаўненьня кадраў змагарэў за сацыялізм, недаацэнка і «пренебрежение» тэй ролі, якую жаночына-працаўніца можа выканаць і выконвае ва ўсім сацыялістычным будаўніцтве, зьяўляецца прычынай таго, што клясавы вораг можа ў сваёй барацьбе супроць сацыялістычнага будаўніцтва выкарыстаць найбольш адсталыя пласты жаночын-работніц і працоўных сялянак.

Гэта недаацэнка і пагардлівасьць знаходзяць свой адбітак у тым, што мы чуем вельмі многа дэкляматый аб вызваленьні жаночыны, аб раўнапраўі, а на справе сустракаемся з «домостроевщиной». Зрыў будаўніцтва ясьлей, грамадзкага харчаваньня, грамадзкіх пралень зьяўляецца поўным паказальнікам гэтай «домостроевщины». Кампанія перавыбараў саветаў, у часе якой вышэйшыя савецкія органы былі прымушаны скасаваць выбары ў радзе месц толькі таму, што ў саветы ня было абрана ніводнай жаночыны, зьяўляецца таксама доводам недаацэнкі і пагардлівасьці ў адносінах да працы сярод працоўных жаночык, якія перарастаюць у скажэньне партыйнай лініі.

Наш партыйна-савецкі друк таксама мае сур'ёзныя недахопы ў данай галіне. Спасылаючыся на часопісы, прысьвечаныя барацьбе і працы работніцы і сялянкі, наш друк надзвычай мала месца аддае гэтым пытаньням. При асьвятленьні цэлага раду кампаній наш друк забывае аб жаночыне-работніцы і сялянцы. Возьмем да прыкладу пастанову бюро ЦК КП(б)Б аб калектывізацыі, надрукаваную ў нашым друку 29 верасьня 1930 году. У гэтай пастанове ёсьць спэцыяльны пункт аб рабоце сярод «бяднацка-сераднацкіх мас жаночын» і аб выкарыстаньні «перавыбарчэй кампаніі дэлегацкіх сходаў для актывізацыі мас жаночын на антыўную барацьбу за умацаваньне калгасаў і арганізацыю новых». У тым-жа самым пункце ЦК КП(б)Б падкрэсьлівае, што недаацэнка работы сярод жаночын павінна разглядацца, «як адна з горшых праяў правага ўхілу на практыцы». Ня гледзячы на гэту катэгарычную дырэктыву, на гэту рэзную, не пакідаючую ніякіх сумненьняў, характарыстыку, наш друк, папупярэдзіўшы гэту пастанову і вядучы барацьбу за калектывізацыю, амаль зусім ігнараваў пытаньне работы сярод жаночын.

Калі пяройдзем да пытаньня масавай работы, дык пераканаемся, што гэта самы слабы вучастак работы. Масавая работа ідзе суцэльнай плынлю, бяз уліку асаблівасьцяй жаночай работы. Нашы апараты і арганізацыі «уповают» на спэцыяльныя органы для работы сярод жаночын і лічаць, што жаночая ніякімі асаблівасьцямі не адрозьніваецца. Між іншым, прафсаюзы, як правіла, не заварочваюць на жаночую работу патрэбнай увагі, ня вылучаюць яе і, літаральна топяць у агульна-саюзнай рабоце. Нават у тэкстыльнай прамысловасьці дзе жаночая праца адыгрывае пераважваючую ролю, мы маем няправільныя, апартуністычныя адносіны да работы сярод жаночын. На «Дняпроўскай Мануфактуры», напрыклад, заўкомаўцы ня бачаць асаблівых задач работы сярод жаночын і не хацелі праводзіць дэлегацкіх сходаў. Такія-ж зьявішчы мы прымушаны адзначыць і на запалкавай фабрыцы «Бярэзіна». І гэта робіцца ў той час, калі на гэтыя фабрыкі паступаюць вялізарныя масы новых работніц з найбольш адсталых пошаў гарадзкога і вясковага пралетарыяту.

Наша каапэрацыя да ўсіх сваіх дэфэктаў і недахопаў лічыць неабходным прыдаць і апартуністычныя адносіны да пытаньняў работы сярод жаночын. А роля жаночыны-работніцы і сялянкі ў справе папаўпэньня нашага каапэрацыйнага апарату магла быць вялізарнай, калі-б каапэрацыя разгарнула належным чынам работу з жаночым каапэрацыйным актывам і наогул масавую работу сярод работніц,—калгасьніц, бяднячак, сераднячак і жонак рабочых. Гэтыя колы працоўных магілы быць вельмі добрай крыніцай для вылучэньня новых каапэрацыйных кадраў.

Такое-ж становішча мы наглядаем і ў калгасных арганізацыях, дзе ў праўленьні амаль што не сустракаецца жаночын. На чале брыгад і на кіруючых пазыцыях калгаснай работы мы ня сустракаем зусім жаночын.

Усе палітычныя і гаспадарчыя кампаніі, ня гледзячы на самыя катэгарычныя дырэктывы кіруючых партыйных і савецкіх органаў, праходзяць без патрэбнага ўцягваньня жаночын, без патрэбнага разгортваньня работы сярод работніц, калгасьніц, беднячак, сераднячан і жонак рабочых. Расьце ўдарніцтва, растуць новыя формы сацыялістычнага спаборніцтва і сацыялістычнае працы, але павышэньню тэмпаў уцягваньня жаночын у гэтыя формы выяўленьня грамадзкай актыўнасьці амаль што не аддаецца ніякае ўвагі.

Надзвычай часта многія галавацяпы, і правыя апартуністы прыкрываюць сваю недаацэнку і пагардлівасьць жанработай важнымі палітычнымі і гаспадарчымі кампаніямі. У адным з раёнаў сакратар сельскай партыйнай ячэйкі заявіў жаночынам - дэлегаткам: «Мне няма калі, вы ня ў час прыйшлі, мы-ж праводзім збожжазагатоўкі». Гэты таварыш забыўся аб необходнасьці ўвязаць кампанію па збожжазагатоўках з работай сярод жаночын, аб необходнасьці ўцягнуць жаночын, у работу па збожжазагатоўках і выкарыстаць дэлегацкія сходы, як зброю партыі і савецкай улады ў справе ўзмацненьня тэмпаў збожжазагатовак. Тымчасам у Круглянскім, Бульскім, Асьвейскім і Чашніцкім раёнах сіламі дэлегатак арганізавана 14 чырвоных абозаў па здачы сваіх лішкаў хлеба дзяржаве.

Калі-б партыйныя органы на мясцох разумелі значэньне работы сярод жаночын і ўзялі-б у свае рукі кіраўніцтва гэтай работай, дык, бясспрэчна, усе палітычныя і гаспадарчыя кампаніі ў іх пашлі-бы энэргічней. Для нас павінна быць ясна, што ільнязагатоўчая кампанія пашла-бы больш здавальняючымі тэмпамі, калі-б раённыя партыйныя, каапэрацыйныя і савецкія арганізацыі ўцягнулі ў гэту работу далегацкія сходы і разварушылі грамадзкую актыўнасьць сялянак.

Тое-ж самае трэба сказаць аб кампаніі па мабілізацыі сродкаў, па правядзеньні пазыкі індустрыялізацыі ў вёсцы, па пашырэньні радоў добраахвотных арганізацый: Аўтадору, МОПР'у, Чырвонага Крыжу, валуначных бязбожнікаў і г. д.

На жаль, мы маем справу ня толькі з апартуністычнай закасьцянеласьцю і недаацэнкай работы сярод жаночын, ня толькі з нежаданьнем і няўменьнем стаць на чале праяўленьняў грамадзкай актыўнасьці працоўных жаночын, але з простым тармажэньнем гэтай актыўнасьці. У мінулым годзе мы былі сьведкамі наступных фактаў па лініі саветаў: з 122 жаночын, абраных старшынямі сельсаветаў, засталося на гэтай рабоце да канца году толькі 64 чал. З 5 жаночын, старшынь РВК, і 3 жаночын—старшынь гарсаветаў, на рабоце не засталося ніводнай. Па лініі прафсаюзаў назіраецца павялічэньне колькасьці работніц у складзе выбарчых органаў, але амаль няма эруху ў адносінах вылучэньня жаночын на самастойную кіруючую работу. Характэрна, што, калі ў праўленьнях калгасаў мы маем 11,1 проц. жаночын, дык у праўленьнях райкалгассаюзаў жаночыны ўжо ня могуць прапезьці—іх там няма.

Апартуністычная недаацэнка работы сярод жаночын мае сваё адлюстраваньне і ў пічках, якія інструюць рост партыі. У той час, калі партыя ўзрасла на 40,3 проц. за пэрыяд часу з 1 студзеня 1928 году па 1 ліпеня 1930 году, дык жаночая прапойка ў партыі за гэты самы адрэзак часу ўзрасла ледзь на 1,1 проц.—з 11,7 проц. да 12,8 проц. Тут мы маем яўнае адставаньне, хоць трэба канстатаваць, што па лініі росту партыі за лік рабочых ёсьць некаторы зрух. За паказаны прамежак часу колькасьць рабочых ад варштату ўзрасла ў партыі з 37 проц. да 46,3 проц., прычым, тэмп росту рабочай праслойкі наогул склаў 176 проц.; тэмп росту жаночым работніц раўняўся 206 проц. Гэты тэмп паказвае тую актыўнасьць жаночын-работніц, якая крышыць закасьцянеласьць, непаваротлівасьць і апартунізм у нашых радох. Адкак, гэты тэмп зусім невыстарчальны.

Апошні пленум ЦК КП(б)Б зьвярнуўся са спэцыяльнай адозвай па поваду жанработы. Гэта адозва наогул ня была партыйнымі арганізацыямі прапрацавана і вывучана, яна ня стала кіруючай дырэктывай у штодзённай рабоце партыйных арганізацый. Трэба цьвёрда запамятаць, што адозва кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б падкрэсьлівала, што: «Недаацэнка работы сярод працоўных жаночын з боку раду партыйных, савецкіх, прафсаюзных і каапэрацыйных арганізацый — ЁСЬЦЬ ГРУБАЕ ПАРУШЭНЬНЕ ШМАТЛІКІХ ПАКАЗАНЬНЯЎ ЛЕНІНА, ДЫРЭКТЫЎ ЦК УсеКП(б) І ЦК КП(б)Б І ПРАВА-АПАРТУНІСТЫЧНАЕ СКАЖЭНЬНЕ ЛІНІІ ПАРТЫІ НА ПРАКТЫЦЫ, а таму партыя будзе рашуча змагацца з праявамі недаацэнкі важнейшага вучастку партыйнае работы».

Час не чакае. Выкананьне плянаў сацыялістычнага будаўніцтва трэцяга раўнаючага году пяцігодкі патрабуе, каб партыйныя, прафсаюзныя і савецкія арганізацыі да канца скарысталі непачатую крыніцу папаўненьня радоў байцоў на фронце сацыялістычнага наступленьня. Трэба жаночыя працоўныя масы ўвесьці ў бой за паскарэньне сацыялістычнага будаўніцтва, трэба мабілізаваць гэтыя вялізарныя рэсурсы пралетарскай энэргіі і сіл для выкананьня пяцігодкі за чатыры гады, для паскарэньня пабудовы фундаманту сацыялізму ў нашай краіне. Трэба выканаць дырэктыву кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б і разгарнуць рашучае змаганьне з праявамі недаацэнкі важнейшага вучастку партыйнае работы «як адным з горшых праяў праваго апартунізму на практыцы».

АРГАНІЗУЕМ НОВЫЯ ЎДАРНЫЯ „СКВОЗНЫЯ“ БРЫГАДЫ ІМЯ ЛЕНІНА

Дапаможам бальшавіцкай веснавой сяўбе

ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ—У ПАРТЫЮ ЛЕНІНА

Таварышы рабочыя і работніцы мэталісты Беларусі!

Прайшло 7 год з дня сьмерці правадыра сусьветнага пралетарыяту Ўладзімера Ільліча Леніна.

Сем год, як камуністычная партыя і пралетарыят страцілі таго, хто на працягу свайго жыцьця зьбіраў сілы рабочае клясы, хто выкоўваў партыю—авангард рабочае клясы—і прывёў яе да пераможнай пралетарскай рэвалюцыі і будаўніцтва сацыялізму ў СССР.

Сем год бяз Леніна, але пад кіраўніцтвам сталёвай ленінскай партыі і яе ЦК рабочая кляса няўхільна ішла і ідзе па паказаным Леніным шляху індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі, ажыцьцяўляючы яго наказ: «Дагнаць і перагнаць перадавыя па тэхніцы капіталістычныя краіны».

Дзякуючы кіраўніцтву камуністычнай партыі, мы маем вялікія посьпехі і буйны рост сацыялістычнай гаспадаркі—на базе рэканструкцыі старых і пабудовы новых заводаў, на базе разгортваньня суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва як класы.

Усё гэта зьяўляецца вынікам ленінскага кіраўніцтва камуністычнай партыі росту яе радоў, актывізацыі рабочай клясы, правільнага кіраўніцтва ленінскага ЦК, які праз рашучую барацьбу з ыццікамі, малаверамі, апартуністамі ўсіх колераў вядзе партыю і рабочую клясу да новых перамог будаўніцтва сацыялізму.

Пасьпяховае скончэньне другога году пяцігодкі і актыўнае ўступленьне ў трэці рашаючы год пяцігодкі яшчэ больш узбройвае нашых клясавых ворагаў як унутры СССР, так і ў капіталістычных краінах. Бачачы посьпехі пралетарыяту СССР у справе індустрыялізацыі краіны, яны з яшчэ большай сілай разгортваюць сваю шкодніцкую работу, стараючыся ўсімі мерамі перашкодзіць і сарваць наша сацыялістычнае будаўніцтва.

Сусьветны капіталізм, задыхаючыся ад унутраных супярэчнасьцяй, шалёна рыхтуецца да нападу на СССР—адзіную бацькаўшчыну сусьветнага пралетарыяту, арганізуючы ў дапамогу сабе шкодніцкія арганізацыі («прампартыя», група беларускіх контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў і інш.) і імкнучыся задушыць рост рэвалюцыйнага руху пралетарыяту, які знаходзіцца пад ярмом капіталізму.

Але ўсе гэтыя ўчынкі капіталістаў ня толькі ня спыняюць нашага пераможнага руху па шляху сацыялістычнага будаўніцтва, але наадварот, яшчэ больш згуртоўваюць рабочую клясу навакол свайго кіраўніка—камуністычнай партыі.

На ўсе шкодніцкія ўчынкі нашых клясавых ворагаў рабочыя масы адказваюць узмацненьнем сваіх творчых сіл і энэргіі для найбольшага скарачэньня тэрміну выкананьня пяцігодкі, аб чым сьведчыць датэрміновае выкананьне заводамі сваіх прамфінпляноў, шырокі ўдарны рух рабочых і г. д.

Нашы дасягненьні ў сацыялістычным будаўніцтве, з аднаго боку, і імкненьні капіталістаў перашкодзіць гэтаму будаўніцтву і задушыць рэвалюцыйны рух—з другога, выклікаюць яшчэ большы рэвалюцыйны ўздым пралетарыяту як Захаду, так і Ўсходу, аб чым сьведчаць забастоўкі 160 тыс. горнарабочых паўднёвага Уэльсу ў Англіі, Руру ў Нямеччыне, Кітаі, Польшчы і інш.

Пралетарыят узмоцнена рыхтуецца да апошняга рашучага бою пад сьцягам Камінтэрну за сусьветную пралетарскую рэвалюцыю, за дыктатуру пралетарыяту ва ўсім сьвеце.

Напярэдадні гадавіны сьмерці вялікага правадыра і настаўніка прэзыдыум Белкамітэту саюзу мэталістаў зварачаецца да ўсіх рабочых мэталістаў з заклікам—ШЧЫЛЬНЕЙ ЗГУРТАВАЦЬ СВАЕ РАДЫ ВАКОЛ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ І НАПРУЖЫЦЬ УСЕ СІЛЫ І ЭНЭРГІЮ ДЛЯ АЖЫЦЦЯЎЛЕНЬНЯ ЯЕ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ.

Узмоцнім сацыялістычную вытворчасьць, шырэй разгорнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва, ліквідуем запазычанасьць ударнага кварталу з перавышэньнем заданьняў трэцяга году пяцігодкі. АРГАНІЗУЕМ НОВЫЯ ЎДАРНЫЯ «СКВОЗНЫЯ» БРЫГАДЫ ІМЯ ЛЕНІНА. Ні аднаго сьвядомага рабочага па-за ўдарнай брыгадай. ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ ПЕРАДАМО Ў ПАРТЫЮ ЛЕНІНА.

Жорсткую пралетарскую самакрытыку ніклруем супроць тых, хто перашкаджае і зрывае прамфінплян—супроць прагульшчыкаў, рвачоў, шкоднікаў, вядучы рашучую барацьбу з малаверамі, ыццікамі, якія імкнуцца перашкодзіць нашаму сацыялістычнаму будаўніцтву.

Возьмем пад агонь самакрытыкі работу гарсаветаў, дабіўшыся 100-процантнага ўдзелу рабочых у перавыбарчых сходах, арганізуем шырокі збор рабочых прапаноў для паляпшэньня працы гарсаветаў, пашлем у саветы лепшых ударнікаў, якія здолеюць узьняць работу саветаў на вышэйшую ступень і павысіць іх ролю ў справе ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі.

Таварышы мэталісты, узмоцнім пралетарскую дапамогу нашым саўгасам і калгасам, бяднацка-сераднацкай масе ў справе сацыялістычнай перабудовы вёскі. ДАПАМОЖАМ БАЛЬШАВІЦКАЙ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЕ, ЗВЯЧАСОВА АДРАМАНТУЕМ ТРАКТАРЫ І ІНШЫЯ С.-Г. МАШЫНЫ, УЗМОЦНІМ ЯКАСЬЦЬ РАМОНТУ, ВЫЛУЧЫМ ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ У БРЫГАДЫ ПА ДАПАМОЗЕ ВЁСЦЫ В ПРАВЯДЗЕНЬНІ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ. Гэтым ажыцьцёвім наказ Леніна: «Барацьба за хлеб — барацьба за сацыялізм».

Мэталісты! Уперад да новых перамог. Наш баявы лёзунг—«ПЯЦІГОДКА—ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ».

НЯХАЙ ЖЫВЕ РАБОЧАЯ КЛЯСА І ЯЕ АВАНГАРД—ПАРТЫЯ ЛЕНІНА!

НЯХАЙ ЖЫВЕ ЛЕНІНСКІ ЦК УсеКП(б) І ЦК КП(б)Б!

НЯХАЙ ЖЫВЕ СУСЬВЕТНАЯ ПРАЛЕТАРСКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ І РАБОЧАЯ КЛЯСА ЎСЯГО СЬВЕТУ!

НЯХАЙ ЖЫВЕ КАМІНТЭРН—АВАНГАРД СУСЬВЕТНАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ, ЯКІ ВЯДЗЕ ЯГО ДА ЗНІШЧЭНЬНЯ КАПІТАЛУ, ДА ДАЛЕЙШЫХ ПЕРАМОГ ПРАЛЕТАРСКАЯ РЭВАЛЮЦЫІ.

ПРЭЗЫДЫУМ БЕЛКАМІТЭТУ САЮЗУ МЭТАЛІСТАЎ.

8 ГОД КАТАРГІ

ДЛЯ КОЖНАГА б. ДЭПУТАТА КЛЮБУ „ЗМАГАНЬНЕ“

Рыхтуючы інтэрвенцыю супроць СССР, польскі фашызм узмацняе крывавы тэрор

Увесь трэці і чацьверты дзень фашысцкае расправы над б. дэпутатамі клюбу «Змаганьне» адбываўся допыт сьведак абвінавачаньня.

Як мы ўжо адзначалі на старонках «Зьвязды» фашысцкая ўлада падрыхтавалася да гэтага працэсу грунтоўна. Пачынаючы ад складу самога суда і канчаючы апошнім дэфэнзыўшчыкам або паліцэйскім — усё лішнае, не адпавядаючае новаму патрабаванню — даказаць камуністычную дзейнасьць падсудных, — усё гэта вымецена, выкінута. Склад суда зьменены поўнасьцю, а дэфэнзыўная фалянга зьменшана напалову. Пакінуты толькі самы «цьвет» дэфэнзыўнай сволачы.

На трэці дзень працэсу з самай раніцы пачынаецца допыт гэтых кітоў абвінавачаньня. Вось перад судзейскім судом праходзіць сьведка **Дыстэргоф—надкамісар паліцыі, начальнік сьледчага аддзелу.** Другі дапытваецца сьведка **Васілеўскі — камісар паліцыі ў Вільні, Ціхоцкі — агент дэфэнзывы ў Маладэчна,** Кусель — паліцэйскі са Слоніма, Навакоўскі — агент дэфэнзывы ў Гдыні, Дайноўскі — агент дэфэнзывы ў Сасноўцах, Мінкевіч — агент дэфэнзывы, Мілеўскі — паліцэйскі з Косава, Скатніцкі — паліцэйскі з Пінска і г. д. **Перад судом вераніцаю праходзяць агенты дэфэнзывы, сышчыкі, паліцэйскія.**

Умовіўшыся напярэдня з судом, па блёкнотніках чытаюць яны свае довады аб вінаватасьці падсудных.

Надкамісар Дыстэргоф паказвае, што «падсудны Гаўрылік у часе прабываньня Чырвонай арміі на абшарах Зах. Беларусі быў камісарам у рэўкоме. Потым быў настаўнікам у Радашковіцкай беларускай гімназіі і, бачыце, нескалькі чалавек з яго б. вучняў за антыдзяржаўную работу засуджаны на катаргу і зараз знаходзяцца ў турмах фашысцкае Польшчы».

Валынец — паводле слоў таго-ж Дыстэргофа — быў якімсьці наглядчыкам над рэвкомам. За набіцьцё, быццам-бы, польскага салдата быў інтэрнаваны.

У чэрвені 1928 году паслы клюбу «Змаганьне» арганізоўваюць сакратарыяты рабоча-сялянскага польскага клюбу у Вілейцы, Ашмянах, Маладэчна, Паставах, Глыбоках і г. д.». Надкамісар паліцыі — грубейшая рыба фашысцкай дыктатуры, у распараджэньні якога знаходзіцца ўвесь паліцэйскі апарат вайводзтва, хмара розных шпікаў і правакатараў — ня змог больш нічога канкрэтнага сказаць супроць падсудных.

Паслухаем далей, што кажа яшчэ наш **камісар паліцыі, кіраўнік сьледчага аддзелу ў Вільні — Васілеўскі.**

«Цэнтральны сакратарыят рабоча-сялянскага пасольскага клюбу быў арганізаваны ў Вільні ў 1929 годзе. Кіраўніком яго быў прызначаны падсудны Астапчык. Жыткевіч быў адказным кіраўніком выдавецтва «Рунь», якое пашырала літаратуру клюбу. Клюб выдаваў пакаленьні каля 13 газэт».

Сьведка — паліцэйскі Кусель паказвае, што «Крынчык быў віцэ-старшынёю т-ва беларускае школы, а ў часе выбараў у сойм у 1928 годзе — даверанаю асобаю ад клюбу «Змаганьне».

Жыткевіч быў сакратаром у Слоніме і пашыраў літаратуру гэтага клюбу (г. зн. легальную літаратуру легальнага клюбу. **С. Ж.**). Падсудны Жыткевіч, паводле дадатковых паказаньняў гэтага самага паліцэйскага, падтрымліваў сувязь з КПЗБ, довадамі чаго зьяўляюцца яго спатканьні на рынку з розным грамадзянамі. Дэфэнзыўшчык Навакоўскі, напрыклад, даводзіць віну падсуднага Лукашыка тым, што Лукашык прадаваў у ТВШ, што калі дэпутат Гаўрылік прыяжджаў у Беласток, дык заўсёды сышыўся ў бацькі Лукашыка, што Лукашык быў інцыятарам арганізацыі т-ва дапамогі галадаючым, што ён пашыраў літаратуру клюбу «Змаганьне».

Ня гледзячы на старанную падрыхтоўку працэсу фашысцкаю ўладаю, усё-ж фальш і фабрыкацыя яго праяўляецца пры выступленьні амаль кожнага сьведкі абвінавачаньня. Так, напрыклад, паліцэйскі Мілеўскі — з Косавяз з КПЗБ, довадамі чаго зьяўляецца сынам багатага сялянина і лясьніка, а другі кіт абвінавачаньня — камісар Васілеўскі гаворыць, што ні Грэцкі і ні бацькі яго, ніякае маемасьці ня мелі, а між іншым, ён траціў на розныя паездкі вялікія сродкі, а значыць, атрымоўваў іх ад кампартыі. Вось тут і разьбярыся. Ня гледзячы на старанную рэжысуру камэдыі — не змаглі нават дагаварыцца.

Выступленьне кожнага агента дэфэнзывы, або паліцэйскага, падсудныя бяруць пад крыжовы агонь апытаньняў. Кіты абвінавачаньня пачынаюць блытацца і вось на выручку ім прыходзіць суд. Падсудныя пазбаўляюцца слова і «довады» застаюцца неабвергнутымі, як гэта мела месца з Гаўрылікам, Крынчыкам і інш. падсудными.

***

Нельга прайсьці міма ўлюбёнага мэтаду польскага фашызму — гэта апаганьваньне ідэёвасьці тэй справы, за якую змагаліся арыштаваныя, а таксама апаганьваньне кожнага з іх у паасобку. Па загаду суда агенты дэфэнзывы шляхам правакацыі тут-жа па судзе імкнуліся агарніць асабіста жыцьцё кожнага з падсудных. Дэфэнзыўныя гадзіны сваімі брудзнымі рукамі стараліся залезьці ў душу сваіх ахвяр, а тым, каб з пачатку, ачарніўшы іх, назьдзекваўшыся досыць, потым кінуць іх на шмат год у каменныя мяшкі.

Пасьля допыту сьведак суд прыступае да агляду довадаў «жэчовых», нібы захопленых у падсудных у часе вобыску. Выклікаецца бегаы экспэрт, які павінен устанавіць і давесьці, што розныя кампрамэтуючыя дакумэнты, захопленыя ў розных мясцох фашысцкае Польшчы пры арыштах камуністаў, пісаны нібы рукою таго ці іншага падсуднага.

Чаго варта такая экспэртыза — на прыходзіцца і гаварыць.

ПРЫСУД

ВАРШАВА, 13. Віленскі суд вынес прыгавар па справе былых дэпутатаў беларускага рабоча-сялянскага пасольскага клюбу «Змаганьне». Чатыры былых дэпутаты: ГАЎРЫЛІК, ДВАРЧАНІН, КРЫНЧУК І ВАЛЫНЕЦ ПРЫСУДЖАНЫ ДА 8 ГОД КАТАРЖНАЙ ТУРМЫ КОЖНЫ. З 6-ці астатніх падсудных — ТРОЕ ПРЫГАВОРАНЫ ДА 4 ГОД І ТРОЕ — ДА 2 ГОД ТУРМЫ.

Нават буржуазная прэса падкрэсьлівае, што падсудныя трымалі сябе на судзе з выключнай годнасьцю.

Юнгаўская Нямеччына пад ударамі крызісу

Нямецкі кан'юктурны інстытут апублікаваў сваю справаздачу за апошні квартал 1930 году, канчаючы дістанадам. Гэты дакумант надзвычайнай важнасьці ў сухіх лічбах малюе ўсю глыбіню распаду капіталістычнай стабілізацыі і з усёй «неумолимой» пераканаласьцю фактаў пацьвярджае ўсю ацэнку далейшага развіцьця сусьветнага эканамічнага крызісу і яго пераходу на палітычныя рэйкі, якая дадзена XVI зьездам УсеКП(б). «Кан'юктурны ўпадак сусьветнае гаспадаркі дасягнуў такіх памераў інтэнсыўнасьці, якіх яшчэ ніколі ня было ў развіцьці гаспадаркі. Тэндэнцыі да ўпадку яшчэ больш абастрыліся. Бесспрэчна ва ўсім сьвеце дасягнута нябачанага росту, які вызначаўся ў 15-18 млн. чал. (гэты лік паменшаны, бо паводле даных іншых буржуазных статыстыкаў сусьветнае беспрацоўе дасягае 25 млн.). Сусьветная гаспадарка прадстаўляе цяпер малюнак усеагульных вьяліпнаў крызісаў і дэпрэсіі, якія пры гэтым усё больш абдастраюцца» (Справаздача кан'юктурнага інстытуту).

Пераходячы да Нямеччыны, справаздача сьцьвярджае, што «сучасны крызіс носіць характар нябачаных да гэтага часу ў Нямеччыне труднасьцяй». Нямецкая індустрыя нагружана толькі на 53-59 проц. (паводле двух розных разьлікаў) сваёй вытворчай магчымасьці. Адна шостая частка рабочых і служачых Нямеччыны зусім выключана з вытворчага працэсу. Даныя і вывады кан'юктурнага інстытуту — гэта ПРЫГАВАР УСЁЙ КАПІТАЛІСТЫЧНАЙ СЫСТЭМЕ.

Буржуазны экаманіст Левэнсон піша ў «Фосіпэ Цэйтунг», што з бэрлінскіх буйных банкаў крэдыторамі вабрана ўкладаў за адзін толькі кастрычнік па суму ў паўмільярда марак. 16 млн. чалавек — палова працоўнага насельніцтва краіны — маюць паўгалодны месячны даход — ніжэй 100 марак. ГОЛАД І ГАЛЕЧА ПАНУЮЦЬ У НЯМЕЧЧЫНЕ. Прамысловы крызіс злучаецца з крызісам аграрным. 4 мільёны карлікавых і дробных сялянскіх гаспадарак (да 5 гакт.) знаходзіцца ў безвыхадна-ніжэйшым становішчы. Агульная сума чужаземнай запазычанасьці НЯМЕЧЧЫНЫ вызначаецца ў 25,1—27,1 мільярдаў марак. Калі з гэтай сумы вылічыць 8,8—10,8 мільярдаў марак заграніччных укладаў Нямеччыны, мы атрымаем суму ў 16,—17,3 мільярды. Адна толькі запазычанасьць па доўгатэрміновых чужаземных пазыках узрасла за апошні год на 20-25 проц.

Такім чынам, Нямеччына абпытана даўгамі і знаходзіцца пад бязупынным націскам замежнага фінансавага капіталу. ВАРТА ТОЛЬКІ ФРАНЦУСКІМ БАНКАМ НАЦІСНУЦЬ НА КРЭДЫТОРА, КАБ ПАСТАВІЦЬ НЯМЕЦКУЮ ГРАШОВУЮ ГАСПАДАРКУ ПЕРАД ПАГРОЗАЙ ІНФЛЯЦЫІ. Па адных толькі рэпарацыях і процантах па даўгох Нямеччына павінна плаціць 240 мільёнаў марак золатам у месяц (даныя кан'юктурнага інстытуту). Увесь гэты цяжар Юнга і вялізарная замежная запазычанасьці нямецкі народ плаціць ЗА РАХУНАК МУСКУЛАЎ ПРАЛЕТАРЫЯТУ, ЗА РАХУНАК ГОЛАДУ І ГАЛЕЧЫ ШЫРОКІХ ПРАЦОЎНЫХ МАС. Нямецкі працоўны народ перажывае, такім чынам, гнёт ПАДВОЙНАЙ ЭКСПЛЁАТАЦЫІ.

(«ПРАВДА»).

КЛЯСАВЫЯ БАІ НА ЗАХАДЗЕ

Гарнякі пераходзяць у контрнаступленьне

Арганізаваны чырвоны прафсаюз гарнякоў Руру

Рабочыя рэфармісцкага прафсаюзу тысячамі пакідаюць рады здрадніка ў

ЭСЭН, 13. У Дуісбургу адбылася грандыёзная далегацкая канфэрэнцыя горнарабочых Рурскай вобласьці, прысьвечаная арганізацыі чырвонага прафсаюзу горнарабочых. У работах канфэрэнцыі, перад адкрыцьцём якой адбылося 100 сходаў у паасобных капальнях Рурскай вобласьці, удзельнічала 1.268 дэлегатаў са 134 капальень. Сярод дэлегатаў — 80 членаў рэфармісцкага прафсаюзу гарнякоў, 8 сацыял-дэмакратаў.

З дакладам выступіў кіраўнік рэвалюцыйнай прафпазыцыі Рурскай вобласьці — тав. Зэфнеў. Калі ён зьвярнуўся з пытаньнем да канфэрэнцыі — ці хочаце вы ў адказ на штрайкбрэхэрства і здрадніцтва рэфармісцкіх і хрысьціянскіх прафсаюзных кіраўнікоў стварыць адзіны клясавы прафсаюз горнарабочых — дык усе дэлегаты з захапленьнем адказалі «да». Пад гукі Інтэрнацыяналу была прынята аднагалосная пастанова аб стварэньні чырвонага прафсаюзу гарнякоў. Многія сацыял-дэмакратычныя і каталіцкія дэлегаты, зганьбёўшы здрадніцтва сваіх былых кіраўнікоў, абвясьцілі аб сваім выхадзе з каталіцкіх прафсаюзаў і ўступленьні ў чырвоны прафсаюз. На вачох усіх дэлегатаў яны рвалі свае прафсаюзныя кніжкі. Канфэрэнцыя прыняла пастанову аб увахадзе чырвонага прафсаюзу гарнякоў у рэвалюцыйную прафпазыцыю і Прафінтэрн.

Пасьля арганізацыі чырвонага прафсаюзу гарнякоў канфэрэнцыя выбрала выканком прафсаюзу ў складзе 50 членаў. У камітэт увайшло 40 гарнякоў, працуючых непасрэдна ў капальнях.

У рэзалюцыі аб арганізацыі чырвонага прафсаюзу канфэрэнцыя заяўляе, што задачамі ўнову арганізаванага прафсаюзу зьяўляецца стварэньне чырвонага адзінага фронту горнарабочых на аснове рэвалюцыйнага клясавага змаганьня. Канфэрэнцыя паставіла перад новым прафсаюзам у якасьці яго бліжэйшай непасрэднай задачы — падрыхтоўку новай забастовачнай барацьбы супроць зьніжэньня зарплаты.

У часе канфэрэнцыі дэлегат ад рабочых адной капальні выклікаў рабочых другой капальні на сацспаборніцтва на лепшай вярбоўцы гарнякоў у новы прафсаюз і лепшай падрыхтоўкі новай забастовачнай барацьбы. Гэтаму прыкладу пасьледвалі многія прадстаўнікі другіх капальень. Многія мясцовыя групы рэфармісцкага прафсаюзу гарнякоў з агульным лікам у 2 тыс. членаў ужо ўступілі арганізаванага ў новы чырвоны прафсаюз гарнякоў. Кіраўнікі гэтых мясцовых груп зьвярнуліся з адозвай да ўсіх гарнякоў Руру, у якой яны заклікаюць пасьледваць іх прыкладу і ўступіць у рэвалюцыйны саюз гарнякоў.

Закрыўся X зьезд ЛКСМБ

УЧОРА X ЗЬЕЗД ЛКСМБ НА СВАІМ АПОШНІМ ПАСЯДЖЭНЬНІ ПРЫНЯЎ РЭЗАЛЮЦЫІ ПА ЎСІХ ДАКЛАДАХ ПАРАДКУ ДНЯ. АКРАМЯ ГЭТАГА БЫЛІ ВЫ

На штурм вышынь трэцяга году пяцігодкі

мабілізаваць шырокія масы работніц, калгасьніц, бяднячак і сераднячак—адзінаасобніц

ПРАЗ ДЭЛЕГАЦКІЯ СХОДЫ ПАДРЫХТУЕМ НОВЫЯ КАЛЁНЫ БАРАЦЬБІТОЎ ЗА САЦЫЯЛІЗМ.

Разьвіваць актыўнасьць

Актыўнасьць калгасьніц, бяднячак і сераднячак-адзінаасобніц з кожным днём ўсё ўзрастае. Пад кіраўніцтвам партыі масы працоўных жанчын прымаюць актыўны ўдзел у выкананьні задач партыі па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, у ажыцьцяўленьні лёзунгу партыі аб ліквідацыі кулацтва як класы на базе суцэльнае калектывізацыі. Асабліва вырасла актыўнасьць мас працоўных жанчын пасьля апошніх перавыбараў дэлегацкіх сходаў, якія пекалькі часу таму назад адбываліся па ўсёй БССР.

У правядзеньні важнейшых палітычных і гаспадарчых кампаній партыі на вёсцы калгасьніцы, бяднячкі і сераднячкі прымалі самы актыўны ўдзел. Аб гэтым таварыць факты. У **Круглянскім, Вульскім і Чашніцкім** раёнах па ініцыятыве дэлегатак было арганізавана 14 чырвоных абозаў па здачы хлеба загатоўчым канцэрацыйным арганізацыям.

Рост актыўнасьці калгасьніц і працоўных мас сялянак знайшоў свой адбітак і ў рабоце грамадзкіх арганізацый. У **Прапойскім** раёне за апошні час у члены Аўтадору ўступіла 75 калгасьніц бяднячак і сераднячак, у члены Чырвонага Крыжу—120, у Саюз Ваяўнічых Бязбожнікаў—85 і ў члены МОПР'у —85 асоб. Гэта новая хваля мас працоўных сялянак у грамадзкія арганізацыі бязумоўна ажыцьць работу апошніх. Асабліва вялікую актыўнасьць праявілі масы працоўных жанчын у справе рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка за чатыры гады». На 20 вясковых раёнах за перыяд перавыбарчай кампаніі дэлегацкіх сходаў рэалізавана сярод дэлегатак абліґацый пазык **на суму 10.970 рублёў.** Быў рад выпадкаў, калі дэлегаткі падпісваліся на пазыку на поўны месячны заработак. Адначасова з гэтым у парадку дабраахвотнасьці дэлегаткі сабралі 1.151 рубель на трактарную калёну і ў фонд розных грамадзкіх арганізацый—103 рублі.

Актыў працоўных жанчын з кожным годам расьце. Калі ў 1929 годзе па 47 раёнах было выбрана ў дэлегаткі 18,8 проц. да агульнага ліку працоўных жанчын, дык зараз, у апошнія перавыбары па 40 раёнах, гэты процант узрастае да 22. У асноўным дэлегацкія сходы сканцэнтраваны пры калгасах і саўгасах. З 710 выбраных дэлегацкіх сходаў 403 працуюць у калгасах, 55—пры саўгасах.

Сярод мас працоўных жанчын, якія прайшлі палітычную школу—дэлегацкія сходы, загартаваліся на грамадзкай рабоце, наглядаецца цяга да ўступленьня ў партыю. За час апошніх перавыбараў дэлегатак па 14 вясковых раёнах батрачкі, бяднячкі і калгасьніцы ў колькасьці 150 чал. падалі заявы аб прыёме іх у партыю. Разам з гэтым паступіла да 40 заяў аб прыёме ў камсамол. Гэта ставіць перад партыйнымі ячэйкамі, як адну з першарадных задач разгарнуць, як сьлед, марксысцка-ленінскае выхаваньне поваўступіўшых дэлегатак у партыю, разгортваць работу па пярбоўцы батрачак і актыўных калгасьніц і бяднячак у рады партыі. У сваёй адозьве ЦК КП(б)В, выданай у перыяд перавыбараў дэлегацкіх сходаў падкрэсьліў: «праз дэлегацкія сходы лепшых работніц, саўгасьніц, калгасьніц і бяднячак-актывістак—у рады нашай партыі».

Гэту задачу павінны пяўхільна ажыцьцяўляць усе партыйныя арганізацыі, усе ячэйкі.

Там, дзе партыйныя ячэйкі сталі на чале актыўнасьці шырокіх мас працоўных жанчын і згуртавалі іх вакол задач сацыялістычнае рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, там мы маем вялікі прыліў дэлегатак у калгасы. За апошні перыяд па 15 раёнах уступіла ў калгасы каля 150 дэлегатак.

Гаворачы аб станоўчых, вялікай палітычнай важнасьці, фактах, якія характарызуюць становішча работы сярод жанчын, мы ня можам абыйсьці міма момантаў недапушчальных, яўна-апартуністычных адносін да работы сярод мас працоўных жанчын.

Задачы пастаўленыя трэцім годам пяцігодкі будуць партыйнымі арганізацыямі выкананы з посьпехам пры ўмове, калі вакол гэтых задач будуць згуртаваны самыя шырокія масы працоўных жанчын, калі яны будуць мабілізаваны вакол канкрэтных задач партыі па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Гэта патрабуе ад усіх партыйных ячэек узмацненьня сваёй увагі рабоце сярод жанчын, па кіраўніцтве дэлегацкімі сходамі.

П. З.

Дэлегацкім сходам —працаздольных кіраўнікоў

Справаздачна-перавыбарчая кампанія дэлегацкіх сходаў зьявілася аглядам становішча работы сярод працоўных жанчын і магутным фактарам мабілізацыі на выкананьне задач сацыялістычнага будаўніцтва. Аднак, трэба канстатаваць, што ў радзе нізавых зьвеньняў партыйнай арганізацыі існуе апартуністычная недаацэнка работы сярод жанчын.

У часе праверкі работы сярод жанчын у радзе ячэек **Бягомльскага** раёну (Бярэзінская, Мсьціская, Канская і інш.) прыходзілася чуць толькі апраўданьні бязьдзейнасьці ў гэтай справе і процістаўленьні работы па правядзеньні гаспадарча-палітычных кампаній рабоце сярод жанчын. Гэтыя ячэйкі ігнаруюць дырэктывы партыі аб увазе ў сёй масавай работы сярод жанчын з практычным ажыцьцяўленьнем задач партыі па вёсцы, аб мабілізацыі працоўных жанчын на выкананьне задач сацыялістычнай перабудовы сельскае гаспадаркі.

Апартуністычную недаацэнку работы сярод жанчын выкарыстоўваюць у сваіх барожых дзеяньнях кулацкія элементы. З прычыны адсутнасьці работы сярод жанчын-калгасьніц бяднячак і сераднячак, найбольш адсталая іх частка надпадае пад уплыў клясавага ворага і аказвае супраціўленьне практычнаму ажыцьцяўленьню мерапрыемстваў партыі на вёсцы.

Паказаныя ячэйкі не праводзяць ніякае работы сярод калгасьніц на ўзмацненьні працоўнай дысцыпліны; не аддаюць патрэбнае ўвагі арганізацыі ў калгасах сацыялістычных мэтадаў працы. Многія калгасьніцы не разумеюць значэньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва і калі ў калгасе **«Чырвоны Пагранічнік» прэміявалі** прыкладных па працы калгасьніцу, дык жанчыны-калгасьніцы выступалі супроць гэтага.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія дэлегацкіх сходаў паказала вялікую актыўнасьць працоўных жанчын, што выявілася ў масавай падпісцы на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады», на часопісь «Беларуская Работніца і Сялянка» і інш. Паміж дэлегацкімі пунктамі заключаны дагаворы сацспаборніцтва аб ударнай рабоце па ліквідацыі нянісьменнасьці.

Гэты зрух у рабоце сярод жанчын партыйныя ячэйкі павінны замацаваць і разьвіваць іх далей, накіроўваючы актыўнасьць жанчын-бяднячак і сераднячак на практычнае ажыцьцяўленьне ўсіх задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Калабаева.

„Завочны запіс у дэлегаткі"

Работа сярод калгасьніц і сялянак-адзінаасобніц у КАРМЯНСКІМ раёне знаходзіцца ў занепадзе. Райком КП(б)Б і большасьць ячэек да гэтага часу не аддаюць патрэбнай увагі задачам уцягненьня працоўных жанчын у практычную работу ажыцьцяўленьня гаспадарча - палітычных кампаній у раёне. Сярод калгасьніц не разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Большасьць парт'ячэек гэтым пытаньнем не займаецца. У выніку апартуністычных адносін да работы сярод жанчын найбольш адсталая іх частка аказвае супраціўленьне ў сваіх сем'ях уступленьню ў калгасы.

Справаздачна - перавыбарчая кампанія дэлегацкіх сходаў па некаторых пунктах праведзена фармальна. Ячэйкі не мабілізавалі працоўных жанчын на выкананьне важнейшых задач партыі ў вёсцы, не забясьпечылі іх прыцягненьня да практычнай работы. У паасобных пунктах перавыбары дэлегатак не адбыліся. У БАРСУКОЎСКІМ сельсавеце вылучаная парт'ячэйкай тав. СІМАНКОВА для арганізацыі дэлегацкага пункту толькі і зрабіла, што склала па свайму погляду сьпіс жанчын і прадставіла яго ў райком. Частка запісаных завочна ў дэлегаткі жанчын нават да гэтага часу ня ведае сваіх абавязкаў.

Пасьля перавыбараў дэлегацкіх сходаў няма ажыўленьня ў рабоце сярод жанчын. Большасьць парт'ячэек у гэтай справе, як і раней, бязьдзейнічае.

ЗАБОЙКА.

Не кіраўніцтва, а тройка апартуністаў

Азярэцкі лесазавод (Талачынскі раён) уступіў у трэці год пяцігодкі з ганебнымі прарывамі. Прычыны гэтага—поўная бязьдзейнасьць заводзкага трыкутніка, недапушчальнае ігнараваньне дырэктыў партыі аб забясьпячэньні выкананьня прамфінпляну. На сутнасьці на заводзе ня было трыкутніка, а былі апартуністычныя элементы на кіруючых пасадах, якія давялі завод да поўнага заняпаду.

Прарывы за сопы квартал па распіловачным цэху павялічыліся. І вось замест прыняцьця адпаведных мер, з боку адміністрацыі для выпраўленьня прастоя на заводзе, замест работы кіраўнікоў на мабілізацыі рабочых мас на ліквідацыю гэтых прарываў, трыкутнік проста адміністрацыйным парадкам павялічыў рабочы дзень з 6 да 10 гадзін і такім мэтадам прабаваў ліквідаваць прарыў. Падсобныя цэхі на заводзе за асобны квартал амаль зусім не працавалі. Цэх па вырабе сарыць зусім не працаваў, а бляначны—з горам напалам—раз на тыдзень. Работа не праводзілася ў гэтых цэхах з прычыны няспраўнасьці варштатаў, а дырэктар заводу на працягу трох месяцаў толькі і рабіў, што даваў абяцанкі прывесьці ў годнасьць варштаты.

Парт'ячэйка і фабком на гэтыя яўна апартуністычныя паводзіны дырэктара заводу не рэагавалі, не ставілі пытаньне перад адпаведнымі органамі аб яго бязьдзейнасьці. Сярод рабочых ніякая масавая работа не праводзілася. Выпучаныя ў цэхах групаводы лічацца толькі групаводамі, а фактычна нічога ня робяць. Палітычныя кампаніі сярод рабочых праводзіліся по грамадзкім нарадам, а выключна адміністрацыйнымі мерамі. Старшыня фабкому **Жуковіч** выклікаў да сябе на чарзе рабочых і ўльтыматыўна заяўляў: «Даём 100 проц. аклад пэнсіі на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады», а інакш—вытурым з заводу».

Парт'ячэйка ніякай увагі не аддавала пытаньню ўзмацненьня працаздольнасьці, не ёмкалася з пратэльчыкамі і нядбайнікамі. Сярод паасобных камуністаў ёсьць такія асобы, якія па шэсць дзён усьцяж ня выходзілі на работу без уважлівых прычын. Гэткія зьявішчы ячэйка пакідала без усякай увагі. Большасьць членаў ячэйкі маюць розныя партыйныя спагнаньні за апартуністычную практыку і іншыя антыпартыйныя паводзіны, на некаторых з іх знаходзяцца справы ў РКК у стадыі вырашэньня. Камсамольская ячэйка таксама бязьдзейнічае. Замест работы, камсамольцы наладжваюць вечарынкі з выпіўкай, займаюцца танцулькамі, гульцёй у карты, іншымі абывацельскімі справамі. Гета ячэйка засьмечана чужымі элементамі.

У пасьцепнай газэце рабочыя сыстэматычна асьвятляюць усе неадпаведныя зьявішчы на заводзе і адсутнасьць работы парт'ячэйкі і ячэйкі ЛКСМ, але гэтыя заметкі зьяўляюцца проста фатаграфаваньнем фактаў і ніякага ўплыву ня робяць. **Злачынствы застаюцца і зараз,** а на рабкораўскія заметкі, зьмешчаныя ў пасьцепгазэце, ніхто не рэагуе.

Дырэктар заводу **Мяндзюк** злоўжывае сваім службовым становішчам. Ён нядаўна патрабаваў для сябе вагон, нагрузіў 30 куба-мэтраў дрывяных абрэзкаў і накіраваў на станцыю Іскоў, дзе знаходзіцца яго жонка.

Гэтыя злачынствы зьяўляюцца нецярпімымі. Кіраўніцтва Талачынскай раённай партарганізацыі павінна зацікавіцца станам лесазаводу і ўжыць усе адпаведныя захады да яго ўздараўленьня.

Калесінскі.

ЦК КП(б)Б і ЦВК БССР

Прэзыдыум усесаюзнага савету прамысловай каапэрацыі ў дні «тыдню Савецкай Беларусі» ў Маскве вітае ЦК КП(б)Б і ўрад БССР. Вялізарныя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва ва ўсіх галінах народнае гаспадаркі БССР, пад кіраўніцтвам ЦК і ўраду Беларусі, на аснове генэральнай лініі партыі, робяць БССР непераможным фарпостам Савецкага Саюзу на стыку з капіталістычным сьветам. Сыстэма прамысловай каапэрацыі БССР зьяўляецца вельмі важным вучасткам у сыстэме прамкаапэрацыі Савецкага Саюзу, садзейнічаючым сацыялістычнаму будаўніцтву і ўзмацненьню абароназдольнасьці краіны. На гэтай адказнай рабоце беларускай прамкаапэрацыі згуртавана ўвага ўсёй сыстэмы прамкаапэрацыі Савецкага Саюзу.

ПРЭЗЫДЫУМ УСЕКАПРАМСАВЕТУ.

Замест сьвяткаваньня калядаў —актыўны ўдзел у лесазагатоўках

ЮРАВІЧЫ (Наш кар.) Члены калгасу «Камунар» пастанавілі ў часе калядаў працаваць на лесазагатоўках. Сродкі, выручаныя за работу, калгасьнікі перашлі выкарыстаць на пабудову ў калгасе радыё-ўстаноўкі. 25 членаў калгасу абвясьцілі сябе ўдарнікамі на ўвесь час лесазагатовак.

Апартуністычная недаацэнка ўзяла верх

БАРЫСАЎ. На заводзе імя Домбаля працуе каля 400 работніц. За апошні час ніякай выхаваўчай работы сярод іх не праводзіцца. Бюро парткалектыву ўскладае гэту работу на цэх'ячэйкі, а цэх'ячэйкі «ківаюць» на заўком. Але заўком наогул ня ведае, колькі работніц ва ўдарных брыгадах і ў вытворчых камунах, нават у заўкоме няма дакладных вестак аб колькасьці работніц, якія працуюць на заводзе.

Работнікі заўкому разважаюць — «мы добра ведаем, што праца сярод работніц вельмі важная справа, толькі ўся бяда ў тым, што часу няма гэтым займацца. Уся ўвага прамфінпляну аддаецца, калі-ж тут жанработу праводзіць».

Кіруючыя арганізацыі заводу ня цікавяцца і бытавым абслугоўваньнем работніц. Яслі, якія ёсьць на заводзе, не здавальняюць запатрабаваньняў работніц, бо яслямі абслугоўваецца толькі адна зьмена, а работніцы, якія працуюць у начной зьмене, яслямі не забясьпечаны.

Такія адносіны да работніц з боку кіраўніцтва заводу кепска адбіваюцца на стане прадукцыйнасьці працы.

ХАЦКЕВІЧ.

АЗАРЫЧЫ. Вылучаны парт'ячэйкай калгасу «Прасьвет» для работы сярод жанчын тав. Трацьцякоў нічога ня робіць. Нянісьменныя жанчыны ня ўцягнуты на ліквпункты, слаба прымаюць удзел у практычным правядзеньні гаспадарча-палітычных кампаній.

Трацьцякоў толькі тое і робіць, што на сходах прызнае віну бязьдзейнасьці, але ад гэтых «прызнаньняў» справе не лягчэй.

Сакратар камсамольскай ячэйкі тав. Каробкін сабрання групы ад жанчын на выпіску часопісі «Беларуская работніца і сялянка» пратрымаў у кішэні, а часопісі ня выпісаў.

Парт'ячэйка здавальняецца толькі фіксацыяй фактаў адсутнасьці работы сярод жанчын.

В. МІЦКЕВІЧ.

ВУШАЧЫ. У раёне шырока разгорнута масавая работа па правядзеньні гаспадарчых і палітычных кампаній. Часта праводзяцца сходы калгасьнікаў і сялян-адзінаасобнікаў. На гэтых сходах прымае ўдзел зусім нязначны процант жанчын, на работу сярод іх парт'ячэйка не зварачае ніякай увагі. Райком партыі не рэагуе на апартуністычную недаацэнку работы сярод працоўных жанчын.

ЮРКА РОСНЫ.

Работа сярод жанчын--адказьнейшы вучастак партработы. Да суровай адказнасьці апартуністаў, якія недаацэньваюць і ігнаруюць адказьнейшую палітычную задачу партыі.

Рэкорд фармальнасьці

Работа сярод працоўных жанчын—забыты вучастак у дзейнасьці **Бабруйскай** раённай партарганізацыі. Дырэктывы партыі аб узмацненьні работы сярод працоўных жанчын, асабліва ў вёсцы, аб забесьпячэньні больш актыўнага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве калгасьніц, батрачак, бяднячак і сераднячак не праводзяцца ў жыцьцё большасьцю ячэек гэтага раёну.

Ва многіх ячэйках няма правільнага разуменьня, што ад узьнацьця работы сярод жанчын на палітычную вышыню ў значнай меры залежыць пасьпяховае выкананьне чарговых задач партыі на вёсцы. І толькі гэтай недаацэнкай асобнай работы сярод калгасьніц, бяднячак і сераднячак можна вытлумачыць прычыны зусім слабога ўдзелу жанчын у справаздачна - перавыбарчай кампаніі сельсаветаў па радзе насельніцкіх пунктаў Бабруйшчыны. Па некаторых сельсаветах у апошнія перавыбары дэлегацкіх сходаў яўка на перавыбарчыя сходы жанчын была ніжэй 50 проц. Раённая партарганізацыя не забясьпечыла выкананьня дырэктывы ЦК аб тым, каб давесьці ў складзе выбраных сельсаветаў каля 35 проц. жанчын. Больш таго, ёсьць выпадкі зьмяншэньня колькасьці жанчын у складзе некаторых саветаў у параўнаньні з перавыбарамі 1929 году.

Зараз разгортваецца падрыхтоўчая работа да веснавой сяўбы. Гэта кампанія павінна быць увязана, галоўным чынам, з арганізацыяй новых калгасаў і масавага прыліву бяднякоў - сераднякоў сялянства ў існуючыя калгасы. Ўцягненьне ў гэту кампанію працоўных жанчын зьяўляецца важнейшай задачай кожнай ячэйкі. Аднак, на справе гэтага няма. Асобная работа сярод вясковых працоўных жанчын недаацэньваецца ў радзе ячэек, недаацэньваецца тое становішча, што адсталасьць частка жанчын, адсутнасьць работы сярод іх імкнуцца выкарыстаць кулацкія элементы ў сваёй варожай дзейнасьці.

Як-жа Бабруйскі РК мабілізуе раённыя партарганізацыі на змаганьне з недаацэнкай работы сярод жанчын? Адказ на гэта можа быць толькі адноўны. Па сутнасьці райком гэтым пытаньнем не займаўся. Калі паглядзець, як райком кіраваў работай сярод жанчын, дык апарата фармальнасьці нічога не ўбачыш.

Месца фактам.

Райком абмяркоўвае пытаньне аб справаздачна - перавыбарчай кампаніі дэлегацкіх сходаў. Замест дачы парт'ячэйкам дырэктыў па правядзеньні перавыбараў, як важнейшай палітычнай кампаніі, зацьвярджаецца толькі каляндарны план перавыбараў. Плины заступаюцца плянамі, а па мясцох пануе бязьдзейнасьць. Кампанія не разгортваецца.

Праз некаторы час зноў пытаньне аб перавыбарах дэлегацкіх сходаў «прапускаецца» праз пратакол насяджэньня бюро РК. У пастанове запіс «зьвярнуць увагу выяжджаючых на раён таварышоў на гэта справу».

І яшчэ «прыняць да ведама» запісаны ў пратаколе нарады сакратароў ячэек КП(б)Б па інфармацыі аб рабоце сярод жанчын.

Такім чынам, «пытаньне ставілі, пытаньнем займаліся». У пратаколах раёнкому аб гэтым ёсьць «адзнакі», толькі кенска, што сапраўднага кіраўніцтва работай ячэек па мабілізацыі працоўных жанчын на выкананьне гаспадарча-палітычных кампаній з боку райкому не было і няма.

Яшчэ маленькая «дэталь». 11 сьнежня райком зацьвердзіў жанорган аднаго таварыша, а 1 студзеня агледзеўся, што прызначаны на пасаду жанорга таварыш не зьяўляецца ні членам, ні кандыдатам партыі. Прынялося скасаваць пастанову.

Камэнтары лішнія. Прызначаць жанорганам, ня ведаючы каго, нават па парт'ыйнасьці — узор рэкорднай фармальнасьці і павархоўнага падыходу да кіраўніцтва работай сярод працоўных жанчын.

БАБРУЙСКІ.

Пляны веснавога паходу

Генэрал Мільлер разбрэхвае пляны падрыхтоўкі анты-савецкай вайны

Белагвардзейская газэта «За свободу» ў радзе нумароў вымушае розныя заявы старшыні белаэміграцкіх заруб'ежных ваенных арганізацый, намесьніка спадчэрніка Куцепава, генэрала Т. К. Мільлера.

У нумары ад 4-га студзеня зьмешчана спэцыяльная гутарка з генэралам Мільлерам — «З чым мы вернемся ў Расію».

У гэтай гутарцы «паважаны» генэрал дзеліцца сваімі ўражаньнямі аб паездцы на Югаславію, Баўгарыі і Румыніі. «Мы гатовы ўсімі сродкамі, — заявіў Мільлер, — дапамагаць тым, хто змагаецца супроць савецкай улады. Уся наша энэргія, уся наша воля павінны быць згуртаваны на адным —на вышукваньні мэтадаў зьвяржэньня ненавіснай улады».

Як вядома, паездка генэрала Мільлера на Балканы мела мэтай інспэктаваньне, фінансаваньне і разьмяшчэньне рэштак белагвардзейскіх часьцей і абсьледаваньне ваенных работы ў белаэміграцкіх калёніях. Генэрал Мільлер вёў спэцыяльныя перагаворы з кіруючымі коламі ў Румыніі, Югаславіі і г. д. Апрача таго, ён выяжджаў у Вэрэрабію, цікавячыся цытаванымі дывэрсійнай работы супроць СССР.

У нумары ад 8-га студзеня ў тэй-жа «За свободу» зьмешчана другая гутарка з генэралам Мільлерам. У ёй проста заяўляецца: «Мы гатовы пачаць вайну, мы чакаем толькі спрыяючых міжнародных абставін і фінансавай дапамогі, якая, насумненна, прыйдзе ад адной з дзяржаў, жадаючых зьнярэньня бальшавікоў і знароту Расіі народу».

Такім чынам, выкрытыя на працэсе «прампартыі» факты падрыхтоўкі, паўказаны імпэрыялістычных колаў Францыі, белагвардзейскіх бандытаў да антысавецкай інтэрвэнцыі атрымалі новае пацьверджаньне.

У белагвардзейскай газэце «Последние новости» ў нумары ад 5-га студзеня зьмешчана гутарка генэрала Мільлера з прадстаўніком «Брыціш Юнайтэд Прэс».

«Последние новости» ўказваюць, што генэрал Мільлер, як старшыня агульна-вайсковага саюзу, заявіў вёўшаму з ім гутарку карэспандэнту «Брыціш Юнайтэд Прэс», што ён толькі што вярнуўся з агляду «сваіх войск на Балканах», знайшоў «дух армії надзвычайна высокім» і бачыць дзень, «калі белая і чырвоная армії сустрэнуцца ў грамадзянскай вайне на маскоўскіх раўнінах». Гутарка даслоўна паўтарае зьмешчанае ў газэце «За свободу».

Вось у асноўным зьмест памянёнай гутаркі.

«Я з генэрам агледзеў, — кажа генэрал Мільлер, — на мае войскі ў Баўгарыі і Югаславіі. Хоць яны прымушаны кожны дзень працаваць, каб пракарміць свае сем'і, яны захавалі дысцыпліну, субардынацыю і дух добра навучанай армії... Нашы рады поўны балных салдат і кадравых афіцэраў. Людзі працуюць цэлы тыдзень у каналах і на фабрыках, а ў выдзеліны парадуюць перад сваімі афіцэрамі. Вядома, насіць зброю ім забаронена. Нам патрэбны цэлы тропы толькі на ўзбраеньне 100.000 чал., тропы гэтыя знойдуцца, калі Эўропа зразумее тое, што даўно ведаем мы, што толькі барацьбой з камунізмам можна адрагаваць рэлігію і цывілізацыю ад пагібелі. У Парыжы існуе вышэйшая акадэмія ваенных навук. Яна ня можа задаволіць усіх жадаючых. Але мы ўжо навучылі 10.000 чал. асновам ваеннай тэхнікі. Мы гатовы, але чакаем, калі паступіць наш тэрмін. Калі Эўропа злучанымі сіламі выступіць супроць камунізму, мы далучымся да другіх армій».

Рад францускіх рэакцыйных газэт перадрукаваў памянёныя вышэй гутаркі. 9-га студзеня ў белагвардзейскай газэце «За свободу» зьявілася шырокае паведамленьне пад загалоўкам: «Папраўкі генэрала Мільлера да інтэрв'ю ангельскага карэспандэнта». Самы характар паведамленьня гаворыць аб тым, што яго апублікаваньне выклікана адпаведнымі «ўказаньнямі» зацікаўленых апаратаў некаторых імпэрыялістычных дзяржаў. Апошнія аказалі націск на генэрала, які разбрахаўся, і прымусілі яго апублікаваць «папраўкі».

Аднак, белагвардзейскі пыл трудна захаваць. «Папраўкі» генэрала Мільлера, перадрукаваныя «Последними новостями» і «Возрождением», выдаюць падпалышчыкаў вайны з галавой. Прыводзім поўнасьцю паказаныя «папраўкі».

«За свободу» выкладае зьмест заявы генэрала Мільлера супрацоўніку «Возрождения», «Існуючая ў эміграцыі ваенная арганізацыя, — заявіў генэрал Мільлер, — мае мэтай захаваць «белы» ваенны апарат, прызначаны, видома, для барацьбы з чырвонымі за вызваленьне Расіі. Да мне, сапраўды, зьявіўся пасьля маёй паездкі на Балканы карэспандэнт лёндонскай газэты «Сэндэй Таймс» і распытваў мяне аб уражаньнях, вынесеных мною з майго падарожжа. Але карэспандэнцыя гэта так, як яна надрукавана ў газэце, зьмяшчае цэлы рад сьцьвярджэньняў, якіх я не рабіў. Напрыклад, у карэспандэнцыі гаворыцца, што я «за ноч магу паставіць армію на ногі». Я гаварыў толькі карэспандэнту, што арганізацыя наша зьвязана строгай дысцыплінай, што мае распараджэньні дасягаюць месца ў той тэрмін, які неабходны для перасылкі лісту або тэлеграмы. Я казаў, што маё распараджэньне безадкладна прыводзіцца ў выкананьне. Але аб тым, што я магу за 24 гадзіны паставіць армію на ногі, гэтага з не казаў.

У карэспандэнцыі ўспамінаецца пра тое, што ў складзе ваеннай арганізацыі ёсьць падрыхтаваныя ваенныя спэцыялісты — кулямётчыкі і авіятары. Гэта зусім правільна. Як магло быць інакш, раз наша ваенная арганізацыя складаецца з ваенных, частка якіх служыла ў тэхнічных войсках?

У карэспандэнцыі сказана, што я інспэктаваў «войска» на Балканах. Ніякіх інспэктарскіх агляды я не рабіў, проста бачыў начальніцкіх асоб з мясцовых аддзелаў і меў зносіны наогул з асобамі, якія да іх належаць.

Роўным чынам у вельмі катэгарычнай форме ў карэспандэнцыі гаворыцца аб тым, што адна з дзяржаў, якія жадаюць зьнішчэньня бальшавізму, нас, напэўна, падтрымае матар'яльна для вызваленьня Расіі. Я жадаў-бы, каб гэта было так, але, на жаль, пакуль ня бачу рэальных падстаў для ажыцьцяўленьня майго жаданьня ў бліжайшым будучым. Зразумела, зараз становішча зьмянілася. У народаў адкрыліся вочы, бо цяжка адчуваць на сабе сусьветны крызіс, які выцякае, галоўным чынам, ад уладарства бальшавікоў у Расіі.

У карэспандэнцыі зьмешчана яшчэ адна недакладнасьць. Там гаворыцца, што ў буднія дні рускія салдаты працуюць, а ў нядзелю «парадуюць перад сваімі афіцэрамі». Ніякіх парадаў ні ў нядзелю ні ў іншыя дні не адбываецца... У нас існуюць ваенныя курсы, на іх адпаўляюць свае ваенныя веды сыны агульна-вайсковага саюзу. Гэтыя ваенныя курсы ня носяць характару ваенных акадэмій. Я не казаў, што руская армія пойдзе на бальшавікоў з другімі эўрапэйскімі арміямі. Што датычыць гэтага пытаньня, дык я ня мог аб ім гаварыць, бо яно залежыць ад палітыкі замежных дзяржаў».

Генэрал Мільлер раней часу разбрахаў пляны інтэрвэнтаў на 1931 год. Ён атрымаў нагаяй ад сваіх імпэрыялістычных гаспадароў. У выніку —«папраўкі». Прыведзены матар'ял зноў пацьвярджае наўпасьць шырокай падрыхтоўкі да антысавецкай інтэрвэнцыі. «Веснавыя пляны» белагвардзейскіх бандытаў поўнасьцю супадаюць з агрэсыўнымі плянамі імпэрыялістычных генштабаў, якія падрыхтоўваюць інтэрвэнцыю супроць СССР. Генэрал Мільлер і яго «войнство» знаходзяцца на ўтрыманьні ў апошніх.

«Правда».

Францускі журналіст аб СССР

ПАРЫЖ, 7. У органе радыкал - сацыялістаў **«Ля Рэспублік»** надрукавана серыя артыкулаў аднаго францускага журналіста, які нядаўна зрабіў паездку па СССР. Гэты буржуазны журналіст **прымушаны канстатаваць посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва, прымушаны быў прызнаць, што рабочы ў СССР жыве лепш, чым у Францыі. Выступаючы** гэтымі днямі ў францускім парламэнце камуністычны депутат **Кашэн** цытаваў некаторыя адрыўкі з артыкулаў гэтага **журналіста.**

У артыкуле з тэй-жа серыі ўражаньняў аб СССР, які надрукаваны пасьля гэтага, аўтар піша: «Некалькі дзён таму назад камуністычны депутат Кашэн зрабіў мне гонар, працытаваўшы мае выказваньні ў «Ля Рэспублік»... Правыя выялі ад злосьці. Але я тут яшчэ раз падкрэсьліваю свае словы. **Да, выгляд у дзяцей у СССР больш здаровы, чым у дзяцей у Бэльвіле** (рабочы раён Парыжу). **І гэта ня толькі ў Маскве... Не,** той-жа малюнак мы бачылі ў Ленінградзе, Ніжнім-Ноўгарадзе, Казані, Самары, Саратаве, Сталінградзе, Растове, Уладзікаўказе, Батуме, Кіеве і Харкаве... Дзеці ўсюды патыкаюць здароўем і ўсё насельніцтва харчуецца досыта. Насельніцтва ўсюды, бязумоўна, добра апрануты і абуты».

Далей аўтар апісвае сыстэму сацыяльнага законадаўства СССР і падкрэсьлівае, што ў СССР усе расходы на сацстраху нясуць прадпрыемствы і ўстановы, тады як у Францыі частка расходаў на сацстраху ўтрымліваецца з зарплаты. (ТАСС).

На што хварэе Гомельскі чыгуначны вузел

Дырэктывы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб праверцы кіруючага складу важнейшых вузлоў, у тым ліку вузлоў БССР, выкліканы неабходнасьцю ўзмацненьня барацьбы з пакладкамі на транспарце і кутчэйшага іх зьнішчэньня.

Мірыцам працаздольнасьці тэй ці іншай арганізацыі зьяўляецца **выкананьне прамфінпляну.** Што-ж паказвае праверка на Гомельскім вузле?

Ня толькі трансфінплян у цэлым, але нават паасобныя вымяральнікі мала прапрацоўваліся ў масах і не даведзены да кожнага рабочага.

Процант папсаваных цягнікоў у ліпені складаў 9,93, у жніўні—10, ня гледзячы на заданьне ў 6,5 проц. папсаваных цягнікоў. На асобны квартал заданьне абмяжоўвала колькасьць папсаваных цягнікоў 4,4 проц., а фактычна ў верасьні было 11,12 проц., у кастрычніку—9,32 проц., лістападзе—9,1 проц., за першую палову сьнежня—6,64 проц.

Ня выканана заданьне на плянавана-папераджальным рамонце, ня выканана заданьне па сярэднясутачным прабегу цягнікоў (прычым невыкананьне гэтага заданьня мае тэндэнцыю росту). Асабліва кепска стаіць справа з выкананьнем **якасных** вымяральнікаў, аб чым сьведчаць выпадкі **паўторнага рамонту цягнікоў, якіх за адзін месяц было 179.**

Асобны квартал яшчэ больш пагаршыў прарыў.

Дзе-ж прычыны такой кепскай работы? Прычыны ў слабой мабілізацыі рабочых мас—як партыйцаў, так і беспартыйных—па выкананьне трансфінпляну, у старых формах і мэтадах работы партыйнай і прафсаюзнай арганізацый.

Арганізацыя сацспаборніцтва і ўдарніцтва на Гомельскім вузле зьяўляецца найбольш слабым месцам. Паводле даных на 20 сьнежня з 3.619 рабочых і служачых ударнікаў ліцьцца 2.260 чалавек. З 772 членаў партыі—ударнікаў 524. Яшчэ больш характарны лічбы па асобных мясцокомах: мясцком № 2 з 1.150 рабочых—596 ударнікаў, з 400 членаў партыі—178 ударнікаў. Па мясцокоме № 4 з 355 рабочых—47 ударнікаў, па мясцкоме № 6 з 249 рабочых—36 ударнікаў, партыйцаў—28, з іх ударнікаў 13 і г. д.

Гэта тлумачыцца тым, што **не нападжана кіраўніцтва ўдарніцтвам.** За ўвесь час быў толькі адзін зьлёт ударнікаў (больш парадны, чым дзелавы). Ударныя брыгады, як правіла, не заключаюць дагавароў на сацспаборніцтва. Выкананьне нязначнай колькасьці саддагавароў не правяраецца.

На вузле шмат выпадкаў п'янства, прыпыхадаў на работу, пакіданьня работы без дазволу адміністрацыі. Такія факты наглядаюцца нават сярод ударнікаў. Гэта сьведчыць аб наяўнасьці ілжэўдарнікаў, з якімі мясцкомы не вядуць ніякай барацьбы.

Навыя формы сацспаборніцтва і ўдарніцтва не разгорнуты. Згодна пяцігодных даных, на вузле арганізавана толькі 7 «сквозных» брыгад. Іншыя формы сацспаборніцтва — грамадзкі буксір, вытворчыя манэўры—засталіся па-за ўвагай партыйных і прафсаюзных арганізацый вузла.

З працаздольнінай на вузле—яшчэ горш. Аб гэтым таворыць рад фактаў самага грубага парушэньня працаздольнінны. Прагулаў у ліпені было 20, у жніўні—84, у верасьні—226, у кастрычніку—290, лістападзе—108. Кожны месяц налічваецца 5-10 выпадкаў прыходу на работу ў п'яным выглядзе. Колькасьць спазьненьняў на работу ў кастрычніку дасягнула 59. Вельмі частыя выпадкі падбаўных адносін да службовых абавязкаў. У кастрычніку было 12 выпадкаў самавольнага кіданьня работы, калі месяцы фактаў адмаўленьня ад работы. Частыя выпадкі, калі на дзякуцтве рабочых стаяць.

Побач з гэтым мае месца кепскі догляд цягнікоў. Адсоль вялікі процант папсаваных цягнікоў.

Рэзкі ўпад працаздольнінны наглядаецца ня толькі сярод беспартыйных, але нават і сярод членаў партыі. Меў месца факт самавольнага кіданьня работы членам партыі, прыход на работу ў п'яным выглядзе

ЗПАР ПланСкан А2В

У АТАКУ ЗА ЛЁН

ЗЛАМАЦЬ СУПРАЦІЎЛЕНЬНЕ КУЛАКА, БЕЗАДКЛАДНА СПАГНАЦЬ ЦЬВЁРДЫЯ ЗАДАНЬНІ!

Разгортваючы масавую палітычную работу,—мабілізаваць калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкія масы на выкананьне і перавыкананьне пляну ільназагатовак

ДАБІЦЦА ЎДАРНАЙ АПРАЦОЎКІ І ЗДАЧЫ ІЛЬНУ КАЛГАСАМІ

Становішча загатовак ільну застаецца пагражаючым. За апошнюю пяцідзеўку плян загатовак выкананы толькі на 2 проц. Такія «тэмпы» выклікаюць сур'ёзную трывогу.

На 10 студзеня плян загатовак ільнавалакна выкапан—**на 20,5 проц.**, пянькі—**на 6,5 проц.**, ільнянога семя—**49,2 проц.** і капанель—**44,2 проц.**

Асноўнай прычынай слабага ходу загатовак зьяўляецца тое, што большасьць раённых партыйных камітэтаў—у ільназагатовачных раёнах усё яшчэ не перабудавалі сваёй работы, не мабілізаваліся на выкананьне пляну загатовак, усё яшчэ апартуністычна спадзяюцца на самацёк.

Замест баявой мабілізацыі ўсіх сіл раёну на выкананьне пляну загатовак, у пасобных раёнах мы маем факты, калі яшчэ ня спынены разважаньні аб нерэальнасьці пляну, аб немагчымасьці іх выканаць. Плешчаніцкі райгандаль ніша дакладную запіску ў Наркамгандаль аб тым, што плян нерэальны, нежыцьцёвы і ў той-жа час нічога ня робіць у галіне ільназагатовак. Замест арганізацыі мас, райгандаль займаецца разнаўсходжваньнем дэмабілізацыйных настрояў.

Справа даходзіньня пляну загатовак да кулацка-заможнага двара праходзіць дрэнна і часта злачынна-фармальна. У радзе раёнаў, ня гледзячы на неаднаразовыя дырэктывы цэнтру, пляны не даведзены да кулацка-заможных гаспадарак. **ЛУКОМСКІ, ГІЛЯНІЦКІ, СЬЛІДЧАНСКІ** і сельсаветы раёну не прад'явілі цьвёрдых заданьняў кулацка-заможным гаспадаркам!

Кантроль над выкананьнем кулакамі і заможнікамі цьвёрдых заданьняў паставлен надзвычай дрэнна, часта кантролю па сутнасьці няма. У раёне ні адна арганізацыя ня ведае, як выконваюцца цьвёрдыя заданьні кулацка-заможнымі гаспадаркамі. У большасьці раёнаў ня ўжываюцца меры пакараньня ў адносінах да кулакоў, якія злосна сабатуюць свае абавязкі перад дзяржавай.

Загатоўчыя арганізацыі таксама яшчэ не перабудавалі сваёй работы для забесьпячэньня выкананьня пляну загатовак. З раду месц атрымліваюцца весткі **аб непадрыхтаванасьці каапэрацый да прыёмкі ільну.** Так, у Вушацкім раёне ў рыначныя дні, калі сяляне вязуць лён, прыёмачны загатоўчы пункт, як правіла, зачынен. Ільнаводныя раёны ўсё яшчэ слаба забясьпечаны патрэбнымі прамтаварамі і асабліва алеем для прэміраваньня здатчыкаў ільнавалакна і ільнянога семя.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што ў радзе раёнаў сацкцкія і калгасна-каапэрацыйныя арганізацыі не мабілізавалі шырокія калгасныя і бядняцка-серадняцкія масы на барацьбу з кулаком і аб'ектыўна патураюць кулаку. Гэтыя арганізацыі ня ўжылі патрэбных мер для таго, каб кулацка-заможная частка вёскі была поўнасьцю абкладзена цьвёрдымі заданьнямі і выканала гэтыя заданьні ў тэрмін.

Становішча загатовак ільну абавязвае ўсе раённыя арганізацыі мабілізавацца на хутчэйшае выкананьне пляну. Неадкладна трэба ўзяць пад асаблівы кантроль выкананьне цьвёрдых заданьняў кулакамі. Трэба рашуча пакончыць з правай практыкай, якая ўсё яшчэ праводзіцца ў некаторых раёнах, трэба дзьяблітасна выкарчаваць агентаў кулака ў нашых арганізацыях.

Калгас „Чырвоная зорка" паказвае прыклад

Калгасы большасьці раёнаў адстаюць у выкананьні пляну загатовак і апрацоўкі ільну. Да гэтага часу большасьць калгасаў ня здолела арганізаваць працу на хутчэйшай апрацоўцы ільну і здачы яго дзяржаве.

Цікавы вопыт правільнай арганізацыі працы ў справе апрацоўкі ільну, нераводу работы на зьдзельшчыну паказаў калгас «Чырвоная зорка» ў вёсцы Гнося, Хойніцкага раёну.

Да 1 студзеня ў калгасе адсутнічала працоўная дысцыпліна. Толькі з 10 гадзіне калгасьніцы палілі ў печы і браліся за апрацоўку ільну. Работа вялася бяз усякага кантролю і вучоту. Зразумела, што пры такой арганізацыі працы калгасьніцы ледзь апрацоўвалі 1 кгр. ільну ў дзень. Апрацоўка ільну вялася абы як, прадукцыя была дрэннай якасьці.

Аграном Белкалгасцэнтру—тав. Шакін, які наведаў гэты калгас, запрапанаваў увесьці новыя мэтады арганізацыі апрацоўкі ільну. Назаўтра-ж была сьлучана спэцыяльная ўдарная брыгада з лепшых 20 работніц калгасу для трапаньня ільну. У першы-ж дзень кожная з удзельніц брыгады за 8-мі гадзінны рабочы дзень апрацоўвала 4-5 кгр. ільну.

Старшыня калгасу запрапанаваў калгасьніцам працаваць з кілёграм-гадзіны, прычым, у залежнасьці ад колькасьці апрацаваных кілёграм ільну будуць залічвацца працоўныя дні. Праз 2 дні апрацоўка ільну павялічылася да 1 кгр. на кожную работніцу ў гадзіну. Гэта выпрацоўка была ўстаноўлена, як норма, для ўсіх калгасьніц.

Праз 4 дні работа па апрацоўцы ільну ў калгасе пайшла зусім іншымі тэмпамі. У работу былі ўведзены мэтады сацыялістычнага спаборніцтва паміж асобнымі калгасьніцамі. Паміж старымі і маладымі калгасьніцамі пачалося спаборніцтва—хто лепш і хутчэй апрацуе лён. Да работы, замест 10 гадзін, пачалі прыступаць а 7 гадзіне раніцы. Калгасьніцы пачалі працаваць з поўнай нагрузкай.

У выніку, замест устаноўленай нормы апрацоўкі 8 кгр. ільну ў дзень, большасьць калгасьніц ужо апрацоўвае па 14-15 кгр. ільну за 8-мігадзінны рабочы дзень.

Прыклад калгасу «Чырвоная зорка» павінен быць уведзен ва ўсіх калгасах.

САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ КАНВЭЕР— МАГУТНЫ СРОДАК ДАЛЕЙШАГА РОСТУ СПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА

Узаемна зьвязаныя брыгады, цэхі, заводы і галіны прамысловасьці—у кола сацыялістычнага канвэеру

„Сацыялістычны канвэер павінен уцягнуць кожную вытворчую адзінку ў барацьбу за бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, за выкананьне пляну рашаючага году пяцігодкі, за пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў СССР".

(З лісту рабочых заводу № 1 імя Авіяхіму).

ХТО НАСТУПНЫ?

ТРЭЦІ РАШАЮЧЫ ГОД ПЯЦІГОДКІ СТАВІЦЬ ПЕРАД НАМІ ВЯЛІЗАРНЫЯ І АДКАЗНЫЯ ЗАДАЧЫ. ГЭТЫЯ ЗАДАЧЫ ПАВІННЫ ВЫКЛІКАЦЬ ТВА І ЎДАРНІЦТВА, УЗДЫМ ГЭТЫХ ФОРМ І МЭТАДАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦВЫШЭЙШУЮ.

ТАКОЙ ВЫШЭЙШАЙ ФОРМАЙ САЦСПАБОРНІЦТВА ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ВОПЫТ РАБОЧЫХ ЗАВОДУ № 1 ІМЯ АВІЯХІМУ ПА АРГАНІЗАЦЫІ **САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА КАНВЭЕРУ** (ГЭТЫ ВОПЫТ ПАДРАБЯЗНА АСЬВЕТЛЕН У «ПРАВДЗЕ», № 8).

ГРУПА РАБОЧЫХ ДРУКАРНІ **ІМЯ СТАЛІНА** — Т.Т. КРЭЙНІН, АРЛЮК, РУБІНШТЭЙН, ГЕЛЬФАНД, ТАТАРСКІ, ФРЫДЛЯНД І ЛЕВІНЧЫК — ПАДАЛА ЗАЯВУ НА АГУЛЬНЫМ СХОДЗЕ, У ЯКОЙ ЗАЯЎЛЯЕ:

«ДЛЯ БОЛЬШ ХУТКАГА ВЫКАНАНЬНЯ ПАСТАНОЎ СЬНЕЖАНЬСКАГА ПЛЕНУМУ ЦК І ЦКК І ВЫКАНАНЬНЯ ПРАГРАМЫ ТРЭЦЯГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ, **ПОЎНАСЬЦЮ ПАДТРЫМЛІВАЕМ ІНІЦЫЯТЫВУ РАБОЧЫХ ЗАВОДУ № 1 ІМЯ АВІЯХІМУ** І ПРАПАНУЕМ АРГАНІЗАВАЦЬ НА НАШЫМ ПРАДПРЫЕМСТВЕ **САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ КАНВЭРНАЕ КОЛА**, АХАПІЎШЫ БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА І ЯГО АДДЗЯЛЕНЬНІ, ДРУКАРНЮ ІМЯ СТАЛІНА З 4-Х ЦЭХАЎ, ДАПАМОЖНЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ, РАНДЛЕВЫ СЭКТАР І БАЗУ.

ВА ЎМОВЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА КАНВЭЕРУ ПРАПАНУЕМ УКЛЮЧЫЦЬ — ВЫРАЗНЫ ТЭМП УСІХ ВЫТВОРЧЫХ ПРАЦЭСАЎ, НЕПАРЫЎНАСЬЦЬ І ЎВЯЗКУ ЎСІХ ПРАЦЭСАЎ РАБОТЫ, ЗАБЯСЬПЕЧЫЎШЫ ВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ 1931 Г. І СВАЯЧАСОВЫ ВЫПУСК ПАДРУЧНІКАЎ І МАСАВЫХ БРАШУР ДЛЯ ХУТЧЭЙШАГА ЗДАВАЛЬНЕНЬНЯ ПАТРЭБНАЙ КНІЖКАЙ І ПРАДУКЦЫЯЙ ПРАЦОЎНЫХ БССР».

ГРУПА ГЭТЫХ РАБОЧЫХ ДАРУЧЫЛА ФАБЗАЎКОМУ РАСПРАЦАВАЦЬ ПАДРАБЯЗНЫЯ ЎМОВЫ І АРГАНІЗАЦЫЙНА АФОРМІЦЬ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ КАНВЭЕР, АБМЕРКАВАЎШЫ ЯГО СЯРОД УДАРНІКАЎ. СХОД ХУВАЛІЎ ПРАПАНОВУ ГРУПЫ ЎДАРНІКАЎ І ПАСТАНАВІЎ, АРГАНІЗАВАЦЬ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ КАНВЭЕР.

ГЭТАЕ ПАЧЫНАНЬНЕ ЎДАРНІКАЎ ДРУКАРНІ ІМЯ СТАЛІНА ПАВІННА БЫЦЬ ПАДХОПЛЕНА ЎСІМІ ПРАДПРЫЕМСТВАМІ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ.

БРЫГАДА 400

Студэнты Горацкай сельска-гаспадарчай акадэміі і зоаінстытуту, атрымаўшы выклік студэнтаў Смаленскага тэхнікуму, парашылі скласьці брыгаду ў дапамогу Аршанскаму чыгуначнаму вузлу па піквідацыі прарываў. 26 сьнежня першая брыгада ў колькасьці 400 чалавек выехала ў Воршу.

Шасьць дзён працавала брыгада ў цэхах і на вузьле. Заработак у суме 2.000 руб. быў перададзены поўнасьцю ў фонд узмацненьня абароназдольнасьці краіны.

Студэнты аказалі вялікую дапамогу вузлу. Частка студэнтаў спаборнічала па якасьці работы з пастаяннымі рабочымі і ва многіх выпадках студэнты перамагалі.

УСОЎСКІ.

Камуна кавалёў імя трэцяга году пяцігодкі на заводзе «Попымя Рэвалюцыі». Камуна ўзяла на сябе абавязак:

канчаткова зьнішчыць прагулы і спазьненьні, давесьці процант браку да нуля, павялічыць прадукцыйнасьць працы на 25 проц., зарплату атрымоўваць у аднолькавым разьмеры, ня гледзячы на розныя разрады, і атрымоўваць яе праз ашчадкасы.

Вытворчыя манэўры выратавалі ад чорнай дошкі

ЗАВОД «ЧЫРВОНЫ АДРАДЖЭНЕЦ» У МАГІЛЕВЕ Ў ПАЧАТКУ ЎДАРНАГА КВАРТАЛУ МЕЎ ВЯЛІЗАРНЫ ПРАРЫЎ. ЗА КАСТРЫЧНІК І ЛІСТАПАД ПРАГРАМА БЫЛА ВЫКАНАНА ТОЛЬКІ НА 53 ПРОЦ. ГЭТА СТАВІЛА ЗАВОД ПАД ПАГРОЗУ ПОЎНАГА ЗРЫВУ ПРАМФІНПЛЯНУ ЎДАРНАГА КВАРТАЛУ.

КАБ ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАРЫЎ, РАБОЧЫЯ ЗАВОДУ АБВЯСЬЦІЛІ ВЫТВОРЧЫЯ МАНЭЎРЫ. ДЗЯКУЮЧЫ ЭНТУЗІЯЗМУ І ВА МНОГІХ ВЫПАДКАХ САПРАЎДНАМУ ГЭРАІЗМУ РАБОЧЫХ, СІЛАСАРЗЗАЧНАЯ БРЫГАДА ПАВЯЛІЧЫЛА ВЫПУСК ПРАДУКЦЫІ Ў 2 ПАЛОВАЙ РАЗ, ЗНАЧНА ПАДЦЯГНУЛІСЯ І ІНШЫЯ БРЫГАДЫ. У ВЫНІКУ БРЫГАДА КАВАЛЁЎ ТАВ. КАСАЕВА СКОНЧЫЛА ПРАГРАМУ ЎДАРНАГА КВАРТАЛУ ДА ТЭРМІНУ — 25 СЬНЕЖНЯ.

ЗАВОД У ЦЭЛЫМ ВЫКАНАЎ ПРАГРАМУ НА 101,9 ПРОЦ.

ЗНАЧНА ДАПАМАГЛІ НОВЫЯ ФОРМЫ САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА, АРГАНІЗАВАНЫЯ Ў ЧАСЕ МАНЭЎРАЎ. ПА ЗАВОДЗЕ БЫЛО АРГАНІЗАВАНА 12 НОВЫХ УДАРНЫХ БРЫГАД, 3 ВЫТВОРЧЫЯ КАМУНЫ, 2 «СКВОЗНЫЯ» БРЫГАДЫ. 185 РАБОЧЫХ (45 ПРОЦ.) ЗАМАЦАВАЛІСЯ НА ЗАВОДЗЕ ДА КАНЦА ПЯЦІГОДКІ. ПАДАНА ШМАТ ЗАЯЎ АБ ЖАДАНЬНІ ЎСТУПІЦЬ У ПАРТЫЮ. ПА ФАБЗАВУЧЫ ТАКСАМА АРГАНІЗАВАНА 13 УДАРНЫХ БРЫГАД.

ЗАРАЗ РАБОЧЫЯ ЗАВОДУ ШМАТ УВАГІ ЗВАРАЧАЮЦЬ НА ПЕРАВЫБАРЫ САВЕТАЎ, НА КАЛДАГАВОРНУЮ КАМПАНІЮ І СУСТРЭЧНЫ ПРАМФІНПЛЯН. ЗАМАЦАВАЎШЫ ВОПЫТ ВЫТВОРЧЫХ МАНЭЎРАЎ, РАБОЧЫЯ З ЭНТУЗІЯЗМАМ РЫХТУЮЦЦА ДА ВЫКАНАНЬНЯ ПРАМФІНПЛЯНУ ТРЭЦЯГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ.

БРЫГАДЗІР БЕЛКАМІТЭТУ САЮЗУ МЭТАЛІСТАЎ ІВАНОЎ.

У ЦІШЫ ГАБІНЭТУ

ПРАМФІНПЛЯН РЭЧЫЦКАГА ЦЬВІКОВАГА ЗАВОДУ, «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ СКЛАДЗЕН СВАЯЧАСОВА. АДМІНІСТРАЦЫЯ ПАСЬПЯЛА НАВАТУ ВЕСЬЦІ ЯГО ДА РАБОЧЫХ У АДНЫМ ЦЭХУ — ЦЬВІКОВЫМ. АЛЕ... ЗАБЫЛІ АБМЕРКАВАЦЬ ПРАМФІНПЛЯН СЯРОД РАБОЧЫХ. ШТО ГЭТА — МАСАБОЯЗНЬ ЦІ ШТО ГОРШАЕ?

ШТО-Б ГЭТА НЯ БЫЛО, ФАКТ ЗАСТАЕЦЦА ФАКТАМ: ПРАМФІНПЛЯН, ЯКІ ПАВІНЕН БЫЦЬ СКЛАДЗЕН **ПРЫ АКТЫЎНЫМ УДЗЕЛЕ РАБОЧЫХ**, СТВОРАН У ЦІШЫ ГАБІНЭТУ ДЫРЭКЦЫІ, ВЯЗ УДЗЕЛУ МАС. АДСУТНАСЬЦЬ РАБОЧАГА КАНТРОЛЮ ПРАЯЎЛЯЕЦЦА. ПРАГРАМА ПА АСНОЎНЫМ ЦЭХУ — ЦЬВІКОВЫМ — **СКАРОЧАНА НА 3.000 СКРЫНЬ**, А ПА ІНШЫХ ЦЭХАХ ЗАСТАЛАСЯ ВЯЗ ЗЬМЕН У ПАРАЎНАНЬНІ З ПРАГРАМАЙ ЎДАРНАГА КВАРТАЛУ. І ГЭТА Ў ТОЙ ЧАС, КАЛІ ПА ВІНТАВЫМ ЦЭХУ, ПЙ ГЛЕДЗЯЧЫ НА ВЯЛІКУЮ КОЛЬКАСЬЦЬ ТЭХНІЧНЫХ ПРАСТОЯЎ, ПРАГРАМА ВА ЎДАРНЫМ КВАРТАЛЕ ПЕРАВЫКАНАНА НА 10 ПРОЦ.

ПРАГРАМА СКАРОЧАНА, НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ ТАКСАМА НА ТОЕ, ШТО НА 1931 ГОД ВЫЗНАЧАН РАД РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКІХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ, ЯКІЯ ПАВІННЫ ДАЦЬ ВЯЛІКІ ЭКАНАМІЧНЫ ЭФЭКТ. МІЖ ІНШЫМ І АБ ГЭТЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАХ РАБОЧЫЯ НЯ ВЕДАЮЦЬ.

МЫ ПАТРАБУЕМ ВЫРАЗНАГА АДКАЗУ: ЧАМУ ПРАМФІНПЛЯН НЕ АБМЯРКОВАН СЯРОД РАБОЧЫХ І ЧАМУ СКАРОЧАНА ПРАГРАМА 1931 ГОДУ.

ФАБРЫЧНЫ.

Адкрыўся ўсебеларускі зьлёт 25-цітысячнікаў

Учора ўвечары ў Доме Селяніна адкрыўся зьлёт ўсебеларускі зьлёт рабочых 25-ці тысячнікаў. На зьлёт зьехалася з усіх куткоў БССР 206 асоб.

Разам з курсантамі ўсебеларускае калгаснае школы ў залі прысутнічае звыш 250 чал.

Зьлёт адкрывае старшыня Белкалгасцэнтру тав. Міцькоў.

У сваёй уступнай прамове тав. Міцькоў гаворыць:

— Вялізарныя посьпехі ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі БССР забясьпечаны шпаркімі тэмпамі індустрыялізацыі краіны. Гэтыя посьпехі абумоўлены ўпартай барацьбой за генэральную лінію камуністычнае партыі, супроць ухілаў ад яе, барацьбой са шкоднікамі, контр-рэвалюцыйнымі беларускім нац.-дэмакратызмам і шавінізмам розных колераў.

Вялізарную дапамогу аказалі нам рабочыя 25-ці тысячнікі. Што-б не гаварылі кулакі і іх падпявалы, 500 рабочых 25-ці тысячнікаў (з іх 100 — сормаўцаў) прарабілі вялізную працу па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі БССР, па яе калектывізацыі.

Потым тав. Міцькоў прапануе абраць прэзыдыум зьлёту. Прысутныя аднагалосна ўхваляюць прапанову абрацьпрэзыдыум у складзе 25 асоб. У прэзыдыум уваходзяць т. т. **Шаранговіч, Гантман, Гаруновіч** (ЦК КП(б)Б), старшыня ЦВК БССР тав. **Чарвякоў**, старшыня ЦКК тав. **Калнін**, наркамзем тав. **Рачыцкі**, прадстаўнікі Калгасцэнтру і Саўгассавету СССР т. т. **Красномовец і Дорынэў**, прадстаўнікі ЦСПСВ і рабочых 25-ці тысячнікаў.

Мільгацяць лілёвыя праменьні «Юпітэраў». Ідзе кіно-здымка...

З прывітаньнем выступае рабочы-вылучэнец заводу **«Дынамо»**, прадстаўнік Калгасцэнтру Саюзу ССР тав. **Красномовец**.

— Задача сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі БССР наглядна ілюструе таму, — гаворыць тав. Краснамовец, — што гэта рэспубліка — прымежная, што за яе рубяжом сваволіць фашысцкая вграя. 25-ці тысячнікі павінны павесьці сваю работу так, каб на плённых вынніках яе вучылася прыгнечанае працоўнае сялянства «Красаў Усходніх» — Заходняй Беларусі і Зах. Украіны, а таксама і каренная Польшчы. На жаль, 25-ці тысячнікі ня ўсюды сустракалі належныя адносіны і кіраўніцтва. 25-ці тысячнікі павінны сваёй штодзённай рабоце растлумачваць асноўным масам сялянства сутнасьць выступленьняў клясавага ворага, сутнасьць правага апартунізму і «лявацкіх» загібаў.

Паводле прапановы т. **Семенякова** зьлёт ухваляе абраць ганаровы прэзыдыум. У ганаровы прэзыдыум уваходзяць **Палітбюро ЦК УсеКП(б), а таксама т. Андрэеў, Гей і Галадзед.**

З прывітаньнем ад імя Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР выступае тав. **Чарвякоў.**

Тав. Чарвякоў перш за ўсё спыняецца на вялізарнай ролі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі ў агульнай барацьбе за сацыялізм.

— Гэта задача, — кажа тав. Чарвякоў, — вымагае сталага ўплыву і кіраўніцтва рабочае клясы. З гэтае прычыны партыя і рабочая кляса і сталі на шлях вылучэньня лепшых таварышаў на кіруючую работу ў калгасы. У прымежнай краіне — БССР гэты момант (пасылка ў калгасы) патрабаваў асабліва напружанай увагі.

Мы павінны адзначыць, што нам удалося, абапіраючыся на бядняцка-серадняцкія масы вёскі, у значнай меры парамагчы супрацўленьне клясавага ворага. Вядучы непрымірымую барацьбу за генэральную лінію партыі мы адзначаем надзвычайна вялікія посьпехі ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. У гэтых посьпехах — вялікая заслуга рабочае клясы Савецкага Саюзу, у прыватнасьці расійскіх рабочых.

Мы адпатоўваем гэтыя посьпехі, каб абапіраючыся на іх разьвіваць і падалей бальшавіцкія тэмпы. Нельга спыняцца на тым, што мы маем.

Вядучы рашучую барацьбу па два фронты, выкарыстоўўшы вялізарны вопыт практычнае работы, мы зможам пасьпяхова выканаць задачы, пастаўленыя ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б у галіне суцэльнай калектывізацыі і на базе яе — ліквідацыі кулацтва, як класы.

Зьлёт заслухаў даклад загадчыка аддзелу агітацыі і масавых кампаній ЦК КП(б)Б тав. **Гаруновіча** аб выніках сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК.

Пасьлена прывітальная тэлеграма **Цэнтральному камітэту УсеКП(б), тав. Сталіну і ЦК КП(б)Б.**

Юр.

РАБОЧЫЯ-«25-ТЫСЯЧНІКІ» ДЭЛЕГАТЫ ЗЬЛЁТУ.

1) Тав. Карчан—старшыня ўдарэйскага нацыянальнага калгасу «Пяцігодка», Пасланы Палатай мер і вагі (Менск). Вытворчы стаж 19 год. Камуніст.

2) Тав. Красноўскі—старшыня калгасу «Культура», Журавіцкага раёну. Пасланы цукернавай фабрыкай «Х Кастрычнік» (Магілеў). Вытворчы стаж 5 год. Камуніст.

3) Тав. Самадураў—старшыня калгасу «Чырвоны партызан», Прапойскага раёну. Пасланы заводам «Красный сормовец» (Н. Ноўгарад). Вытворчы стаж 7 год. Камуніст.

4) Тав. Пятроў—старшыня калгасу «Камунар», Прапойскага раёну, пасланы электрастанцыяй гор. Магілева. Вытворчы стаж 31 год. Камуніст.

5) Тав. Палавінко—старшыня калгасу «Чырвоны партызан», Лельчыцкага раёну. Пасланы заводам імя Томскага (Рэчыца). Вытворчы стаж 8 год. Камуніст.

6) Тав. Канашэвіч—нам. старшыні райкалгассаюзу Вузьдзенскага раёну. Пасланы фабрыкай «Рабочы» (Барысаў). Вытворчы стаж 26 год. Камуніст.

ВОПЫТ „ОРЕХОВСТРОЯ"— НА БУДОЎЛІ БССР

ЯК МОЖНА БУДАВАЦЬ БЯЗ ЦЭМЭНТУ, ЦЭГЛЫ І ЖАЛЕЗА

Да пачатку будаўнічага сэзону засталося некалькі дэкад. Ад сваячасовай падрыхтоўкі да яго, ад сваячасовага пачатку будаўнічых работ будзе залежаць у значнай ступені выкананьне дырэктывы сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб зьніжэньні сабекошту будаўніцтва на 12 проц.

Практыка апошніх год паказала, што большасьць нашых будаўнічых арганізацый яшчэ **не навучылася будаваць танна і рацыянальна.** Многія нашы будаўнікі яшчэ ніяк ня могуць растацца з дзедаўскімі аджываючымі мэтадамі будоўлі, з драпежніцкім марнаваньнем дэфіцытных матар'ялаў, як цэмэнт, жалеза, цэгла. Там, дзе можна затраціць тону цэмэнту, у нас часта пускаюць дзесяткі. Тое-ж у адносінах жалеза і іншых дэфіцытных матар'ялаў.

Дагэтуль будаўнічыя арганізацыі ішлі па найменшай лініі супраціўленьня — калі няма патрэбнай колькасьці жалеза ці цэмэнту, значыцца, трэба спыняць будоўлю. Так кансэрвавалі пачатыя або амаль гатовыя будоўлі. Аб тым, **каб замяніць дэфіцытныя матар'ялы мясцовымі, якія ёсьць у патрэбнай колькасьці аб тым, каб зьмяніць даўно аджыўшыя нормы ўжываньня будаўнічых матар'ялаў,** аб гэтым мала хто думаў. Большасьць будаўнічых арганізацый хвалася за «аб'ектыўныя» прычыны.

У сувязі з гэтым, асаблівай увагі ўсіх будаўнічых арганізацый БССР заслугоўвае вопыт **«ОРЕХОВСТРОЯ»**— маладой, але вельмі энэргічнай арганізацыі, якая на справе даказала, **як можна будаваць без цэмэнту, цэглы і жалеза.**

Прадстаўнік Маскоўскага інстытуту дзяржаўных пабудоў т. **ТАМАРОВІЧ** дзяліўся вопытам работы «Ореховстроя» з беларускімі гаспадарнікамі і інжынэрамі і тэхнікамі-будаўнікамі на нарадзе, прысьвечанай падрыхтоўцы да будаўнічага сэзону, скліканай па ініцыятыве **РСІ** і Беларускага аддзяленьня **«ВОРСА».**

«Ореховстрой» займаецца пераважна жыльлёвым і грамадзянскім будаўніцтвам. Зразумела, што заяўкі «Ореховстроя» на будаўнічыя матар'ялы ў мінулым годзе былі значна скарочаны. «Ореховстрой» мог-бы зрабіць так, як звычайна часта робяць у такіх выпадках нашы будаўнічыя арганізацыі— скараціць будаўніцтвы, выкрэсьліць са сваёй будаўнічай праграмы палову вызначаных аб'ектаў.

Але апарат «Ореховстроя» складзен зусім з іншага чалавечага матар'ялу, з людзей, для якіх «аб'ектыўныя» прычыны ня існуюць. Усё гэта маладыя інжынэры, спорчыўшыя савецкія ВТНУ.

І вось гэтыя людзі зрабілі рэвалюцыйны пераварот у будаўніцтве і знайшлі выхад са становішча. Па-першае, яны зьмянілі нормы ўжываньня дэфіцытных матар'ялаў, па-другое, замянілі дэфіцытныя—цэмэнт, металь і цэглу—іншымі матар'ялямі.

У Бранска-Кіеўскім раёне амаль на паверхні зямлі залягаюць вялікія паклады **ТРЭПЕЛУ.**

Трэпел—гэта інфузорная зямля, якая ўладае ліпкасьцю і ў злучэньні з вапнай і шлакам можа замяніць цэмэнт. Вось з гэтага трэпелу «Ореховстрой» і пачаў будаваць дамы.

У Арэхаве-Зуеве можна ўбачыць рад шматпавярховых дамоў, пабудаваных з трэпелу і цэглы без адзінай тоны цэмэнту. Гэта дае вялізарнейшы эфэкт. На кожным шматпавярховым будынку ёсьць эканомія ў разьмеры звыш **600 БОЧАК ЦЭМЭНТУ.**

Наступным рэвалюцыйным мерапрыемствам, якое ажыцьцявіў «Ореховстрой», гэта кладка сьцен ад фундаманту да даху ў **ПАЎТАРЫ ЦАГЛІНЫ** замест 2,5 па норме. У Арэхаве-Зуеве пабудаваны пяцівавярховыя дамы таўшчынёю ў паўтары цэглы. Гэтыя дамы даволі моцныя.

Гэта дае 40 проц. эканоміі цэглы. Замест трох дамоў, якія, напрыклад, будуюць у Менску, у Арэхаве-Зуеве з тэй-жа колькасьці цэглы будуюць ЧАТЫРЫ ДАМЫ.

Але «Ореховстрой» будуе і бяз цэглы, якая замяняецца трэпелавымі цаглінамі. Апошняя робіцца звычайна тут-жа на будоўлі. Трэпел размолваецца на спэцыяльных саматужных млынох. У злучэньні са шлакам і вапнай атрымліваецца трэпела-шлакавае цеста, якое праз 12 гадзін застывае і пры дапамозе фармоўкі ператвараецца ў цаглины патрэбных разьмераў. Гэтыя цаглины ў сваю чаргу цэмэнтуюцца гарачым трэпелавым растворам.

Ня меншага эфэкту «ореховстроязцы» дабіліся ў выдаткаваньні жалеза. Па нормах ЭКАНА на кожны кубамэтр трэба выдаткоўваць 5 кгр. мэталю, а «Ореховстрой» выдаткоўвае **толькі 1/4 кгр.**

Вопыт «Ореховстроя» неабходна зараз-жа, ня трацячы ні хвіліны, перанесьці на будаўніцтва Савецкай Беларусі. Ужо ў надыходзячым будаўнічым сэзоне будаўнічыя арганізацыі БССР павінны перайсьці на новыя віды эфэктыўных будаўнічых матар'ялаў.

Цагельні трэба прыстасаваць да вырабу эфэктыўнай цэглы. Трэба зараз-жа высьветліць паклады трэпелу і вызначыць шляхі яго дастаўкі да пабудоў. Калі ў Беларусі няма трэпелу, ёсьць зараз-жа падумаць аб прывозе яго з Калуска-Бранскага раёну.

Старшыня горнага аддзелу ВСНГВ т. **РОЗІН падзяліўся** з удзельнікамі нарады аб пакладах трэпелу на тэрыторыі БССР. Такія паклады пакуль што **знойдзены па Сожы,** дзе яны залягаюць на фасфарытах магутнасьцю ў 2 з пал. мэтры на плошчы ў некалькі гэктараў. Апрача таго, **знойдзены паклады трэпелу пя Крычава,** але як першыя, так і другія не вялікія. Наогул паклады трэпелу ў БССР яшчэ мала дасьледаваны. Пакуль ня будуць, як належыць, дасьледаваны паклады трэпелу ў БССР, нам прыдзецца карыстацца прывозным трэпелам.

За 30 клм. вышэй Гомелю, каля в. Юркавічы, **знойдзены паклады апокінкрэмнязёмістыя адипады,** якія могуць замяніць шлак. У якасьці шлаку можа быць яшчэ скарыстан тарфяны попел, які ў нас таксама ёсьць (Асінбуд, Добруш).

Прадстаўнік Белбудаб'яднаньня тав. **АЙЗЭНБЭРГ** падкрэсьліў, што дагэтуль будаўнічыя арганізацыі БССР яшчэ вельмі мала зрабілі для таго, каб у трэцім годзе пяцігодкі перайсьці на новыя эфэктыўныя віды будаўнічых матар'ялаў і дабіцца зьніжэньня сабекошту будаўніцтва. **У гэтым сэзоне вызначана выпусьціць толькі 30 млн. штук эфэктыўнай цэглы з прымешкай апілак і торфу.** Гэта дасьць значную эканомію. На сёньняшні дзень мэтазгодзен завоз трэпелу.

На нашых сілікатных заводах ёсьць магчымасьць выраблiць сілікацыт—сумесь вапны і пілавіднага пяску. У раёне Крычава і іншых мы маем паклады і вапны і пяску. Сілікацыт па моцнасьці можа замяніць бэтон. У гэтым напрамку павінна быць зараз накіравана наша ўвага.

Прадстаўнік Менбуду т. **ЯКУШКА** адзначае, што хоць некаторыя віды новых будаўнічых матар'ялаў у Менску і былі вядомы, але яны ня ўжываліся. Зараз мы маем магчымасьць рабіць кладку сьцен у паўтары цаглины на цёплым растворы. Па лініі гарсавету і камгасу ўжо ёсьць адпаведнае распараджэньне. На нашых заводах ёсьць магчымасьць выраблiць пористую цэглу, што дасьць 25 проц. эканоміі цэглы.

Адначасова пры **ВОРС'е** адбылася нарада будаўнікоў - рацыяналізатараў якія абмяняліся думкамі аб рацыяналізатарскіх мерапрыемствах, што праводзяцца на нашых будоўлях.

Амаль усюды рацыяналізацыя натыкаецца **на коснасьць, бюракратызм і тэхнічную адсталасьць нашага адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу.**

Прыкладам гэтага можа служыць наступны факт. Рабочыя-амэрыканцы, якія працуюць на нашых будоўлях, запрапанавалі ўжываць перагародкі амэрыканскай сыстэмы. Па адным Белбудаб'яднаньні ўжываньне такіх перагародак дасьць каля 140.000 руб. эканоміі ў год. Але кансэрватызм адміністрацыйнага пэрсаналу перашкаджае хутчэйшаму ажыцьцяўленьню гэтага мерапрыемства.

Самым прасьцейшым рацыяналізатарскім мерапрыемствам зьяўляецца вывазка будаўнічых матар'ялаў на санная дарозе. Між тым, ні адна будаў

ЗАВЕРШЫМ ПАБУДОВУ ФУНДАМАНТУ
САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЭКАНОМІКІ
У 1931 годзе на сацыялістычную рэканструкцыю народнае гаспадаркі БССР асыгнавана 464 млн. руб.

Бальшавіцкімі тэмпамі разгарнуць падпіску

Асноўная сума выпушчанай пазыкі «Пяцігодка — за чатыры гады» — 750 млн. руб. перакрыта ўжо да 1 студзеня. Кантрольныя лічбы па Саюзе выкаканы на 101,8 проц.

Рабочая клясa, якая зьявілася ініцыятарам выпуску пазыкі «Пяцігодка — за чатыры гады», з вялікім энтузіязмам адгукнулася на заклік партыі і ўраду падпісацца на пазыку і паказала вялікую адданасьць генэральнай лініі партыі і справе сацыялістычнага будаўніцтва. Плян рэалізацыі пазыкі сярод рабочых і служачых значна перавыкананы.

Выкрыцьцё інтэрвентаў паслужыла моцным штуршком для новага ўздыму энтузіязму працоўных мас. Гнеўныя пратэсты рабочых суправаджаліся амаль на ўсіх прадпрыемствах дадатковай падпіскай на пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады». Энтузіязм рабочых выліўся ў сацыялістычнае спаборніцтва па перавыкананьню заданьняў пазыкі.

Аднак, трэба з усёй рашучасьцю падкрэсьліць, што, ня гледзячы на перавыкананьне кантрольных лічбаў, рэалізацыя не дала ўсіх тых вынікаў, якія яна магла і павінна была даць.

На БССР на вёсцы рэалізавана толькі 87,3 проц. заданьня. Есьць раёны, дзе рэалізавана ня больш паловы кантрольных лічбаў.

Па гарадох не ахоплены падпіскай тысячы рабочых. У адным Менску не ахоплена больш 6.000 чалавек. Плян рэалізацыі сярод неарганізаванага насельніцтва выкананы толькі на 75 проц.

Між тым, фінансавы плян трэцяга году патрабуе напружаньня ўсіх фінансавых рэсурсаў, самай шырокай мабілізацыі сродкаў. У гарадох трэба ахапіць падпіскай усе 100 проц. рабочых, улічваючы вялікія грашовыя рэсурсы вёскі, трэба дабіцца, каб кантрольныя лічбы рэалізацыі на вёсцы былі перавыкананы.

Необходнасьць пагыбленьня рэалізацыі пазыкі ў сувязі з вялікімі гістарычнымі задачамі трэцяга году пяцігодкі, добра зразумелі рабочыя масы.

Мы сёньня дукуем прапанову рабочых заводу «Энэргія» аб выпуску дадатковай сумы пазыкі «Пяцігодка — за чатыры гады». Гэта прапанова заслугоўвае самай сур'ёзнай увагі і падтрыманьня.

Наша задача — у бліжэйшы час бальшавіцкімі тэмпамі разгарнуць кампанію рэалізацыі, у асаблівасьці на вёсцы, шырока ахапіўшы калгасы і адзіначасьцы сакратары ўсімі мерамі грамадзкай ульдзейнасьці, прымусіўшы кулака набыць аблігацыі.

Павышаная кантрольная лічба рэалізацыі пазыкі павінна быць поўнасьцю выканана.

Да адказнасьці—за бязьдзейнасьць

На апошнім пасяджэньні Менскай гарадской камісіі садзейнасьці дзяржкредыту быў заслуханы даклад гарадской масы ангажаванасьці аб мабілізацыі сродкаў.

Камісія адзначыла, што гарадская каса працуе бяз усякага кіраўніцтва. За асобны квартал заданьне па ўцягненьні фізычных уладаў выканана толькі на 10 проц., па рэалізацыі пазыкі — на 82 проц. Асабліва дрэнна праведзена падпіска сярод неарганізаванага насельніцтва. Каса вельмі дрэнна абслугоўвае прымацаваных да яе калектываў.

Гарадская камісія садзейнасьці пастанавіла перадаць справу Менскай гарадской касы ангажаванасьці пракуратуры для прыцягненьня не за бязьдзейнасьць у мабілізацыі сродкаў да судовай адказнасьці.

На гэтым-жа пасяджэньні былі заслуханы інфармацыі аб рабоце камісій садзейнасьці раёўленьня ЦРК, гуты «Пралетарый», ШКЗ і прыгарадных сельсаветаў. Гарадская камісія садзейнасьці прызнала работу камсаду ЦРК і гуты «Пралетарый» незадавальняючай. На ЦРК не ахоплены ніяка падпіскай 30 чалавек, заданьне на пазыку ня выканана на 2.000 руб.; на гуце «Пралетарый» не ахоплена 40 чалавек; прыгарадны сельсавет вельмі слаба ўцягнуў у падпіску сялянаадзіначасобнікаў.

Не спагнана 2 міл. руб. страхоўкі

Плян дзяржаўнага абавязковага акладнога страхаваньня выкапан дагэтуль на 85 проц. Не спагнана каля 2 мільёнаў рублёў.

Калгасы выканалі заданьне на 53%. З кулацкіх гаспадарак спагнана толькі 83,5 проц. акладу і 33 проц. нядоімак мінулага году.

Такое выкананьне пляну пельга лічыць здавальняючым. Некаторыя РВК прымірыўча аднесьліся да спагнаньня страхавых плацяжоў з кулацкіх гаспадарак. Аршанскі, Багушэўскі, Жлобінскі, Старобінскі, Уваравіцкі, Мазырскі, Патрыкаўскі і Вульскі РВК, ня гледзячы на шматлікія напамінаньні, не далі вестак аб спагнаньні страхоўкі з кулакоў.

Усе тэрміны скончыліся, а між тым ні адзін з РВК ня выканаў поўнасьцю страхавога пляну; Глускі РВК выканаў плян на 67,5 проц., Рэчыцкі — на 67,9 проц., Азарыцкі — на 72 проц., Уваравіцкі — на 74 проц. і г. д. Вельмі дрэнна ідзе збор акладу ў гарадох, асабліва ў Віцебску, які выканаў плян на 56%, і ў Добрушы — на 52%.

Дырэктыва аб сваячасовым зборы страхавых плацяжоў павінна быць поўнасьцю выканана. Усе РВК і гарсаветы павінны праверыць работу сельсаветаў і спагнаць адразу-ж аклад і нядоімку з кулацкіх гаспадарак, шляхам сацспаборніцтва праверыць і сабраць нядоімкі з сялян-адзіначасобнікаў, уцягнуць у гэту справу сацыялістычны сэктар вёскі. Да адказнасьці тых, хто патурае кулаку і дапамагае яму сабатаваць выкананьне фінансавых абавязацельстваў!

Ф. Ш.

На барацьбу з прыватным патаемным гандлем

Прыватны гандаль займае вельмі назначнае месца у агульным тавараваротце БССР. У апошні час зарэгістравана толькі каля 800 дробных прадпрыемстваў, якія плацяць устаноўленыя паляткі. Ва многіх гарадох і раёнах зусім няма легальнага прыватнага гандлю.

Але адначасова з гэтым значна напырылася нелегальная гандлёвая дзейнасьць прыватніка. Задача фінансавападатковага апарату — выявіць патаемных гандляроў і прыцягнуць іх да абкладаньня падаткам. Падатковы апарат павінен штодзенна бязупынка сачыць за ўсімі маньўрамі прыватніка, які шукае розных шчылін, каб працягваць сваю дзейнасьць.

Трэба адзначыць, што вакол гэтай справы не мабілізавана ўвага савецкай грамадзкасьці. Фінансавыя органы часта не атрымліваюць належнай дапамогі ў барацьбе з патаемным гандлем.

Вось яркі прыклад. Рэчыцкі фінансавы інспэктар выявіў аднаго нелегальнага гандляра-перакупшчыка. Ён зусім правільна па законе затрымаў забраны ў спэкулянта тавары да аплаты апошнім усіх падаткаў за доўгі час патаемнага гандлю. Але рэчыцкі пракурор т. Маргус, які павінен дапамагаць фінансавому апарату, перашкаджае яму. Ён прапануе інспэктару вярнуць адабраны ў спэкулянта тавары. Інспэктар выконвае прапанову пракурора і аддае спэкулянту частку забраных тавараў. Але другой часткі ён ня можа вярнуць, бо яна прадана каапэрацыі.

Пракурор Маргус аддае інспэктара пад суд за перавышэньне ўлады. Суд апраўдвае інспэктара і тым самым асуджае паводзіны пракурора. Гэты прыклад паказвае, як некаторыя пракуроры разумеюць і праводзяць у жыцьцё **лёзунг аб рашучым наступленьні на капіталістычныя элемэнты.**

Трэба з усёй рашучасьцю пакончыць з прымірэнчымі адносінамі да патаемнага гандлю і разгарнуць самую жорсткую барацьбу з ім.

Зразумела, усе мерапрыемствы па барацьбе з нелегальным прыватным гандлем ні у якім разе не павінны парушаць нармальнай дзейнасьці мясцовых рынкаў, абмяжоўваць вольны продаж прадуктаў сялянскай гаспадаркі.

Нарэшце, трэба пакончыць з анархістычнымі гутаркамі аб тым, што «ў нас няма прыватніка», што ён зусім сыніў сваю дзейнасьць. Такія гутаркі даюць магчымасьць спэкулянтам разгортваць патаемны гандаль і ўнікаць абкладаньня дзяржаўнымі падаткамі.

З.

Падпіскай на пазыку, укладамі ў ашчадкасы, поўным зборам плацяжоў дапаможам выканаць фінансавы плян сацыялістычнага наступленьня

Дадатковай падпіскай ударым па плянах ворагаў

Улічваючы, што сацыялістычнае будаўніцтва зьяўляецца справай самой рабочай клясы, што фінансавы плян 1931 году патрабуе вялікіх сродкаў па сацыялістычную рэканструкцыю народнай гаспадаркі, **агульны сход жыхароў жанту № 8 дадаткова падпісаўся на пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады» на суму 565 руб. і выклікаў жанты №№ 1 і 9.**

— Няхай наш працоўны рубель нанясе моцны ўдар на плянах ворагаў, якія перашкаджаюць мірнаму сацыялістычнаму будаўніцтву, — гаворыцца ў рэзалюцыі.

Павялічыць суму выпушчанай пазыкі

Для выкананьня вялікіх работ трэцяга рашаючага году пяцігодкі нашай дзяржаве патрэбны вялікія сродкі.

Гэтыя сродкі могуць даць толькі рабочая кляса і асноўныя масы сялянства Савецкага Саюзу, бо на крэдыты з-за мяжы спадзявацца няма чаго.

Сума выпушчанай пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады» наогул перавыкананa. Але і дагэтуль многа новых рабочых не ахоплены яшчэ падпіскай. Далёка яшчэ ня скончана работа па рэалізацыі пазыкі на вёсцы.

Савецкі ўрад павінен правесьці дадатковы выпуск пазыкі «Пяцігодкі—за чатыры гады». Ён можа быць упэўненым, што рабочая кляса горача падтрымае гэта мерапрыемства ўраду.

Рабочыя-ўдарнікі кацельнага цэху заводу «Энэргія» Цыпкін і Галярштэйн.

Беднякі, сераднякі і калгасьнікі ўхваляюць пастанову ўраду аб адначасовым зборы

«Зьвязда» атрымала з раду месц шмат рэзалюцый агульных сходаў калгасьнікаў, бедняко ў і серадняко ў адзіначасобнікаў. Рэзалюцыі кажуць аб тым, што асноўныя масы сялянства горача адгукнуліся на пастанову ўраду аб адначасовым падатку на гаспадарчае і культурнае будаўніцтва ў вясковых раёнах. У рэзалюцыях ухваляецца выданьне закону, які ідзе насустрач запатрабаваньням бядняцка-серадняцкіх мас вёскі аб дадатковым зборы сродкаў на гаспадарча-культурныя мерапрыемствы.

Вось, напрыклад, агульныя сходы сялян вёсак Навасёлкі, Шатравіны, Машкова, Бабінічы, Аршанскага раёну, вынесьлі пастановы, у якіх падкрэсьліваюць, што шырока разгорнутая работа па сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі і падрыхтоўцы кадраў да сацыялістычнага будаўніцтва патрабуюць усё большых і большых укладаньняў, і таму сходы лічаць зусім сваячасовай пастанову аб асобным зборы.

6.000 рабочых—без аблігацый

Паводле вестак Менскага гарфінаддзелу, на 1 студзеня па Менску рэалізавана аблігацый пазыкі «Пяцігодка — за чатыры гады» на суму 2.720 тыс. руб., або 93 проц. заданьня.

На Менску яшчэ не ахоплена падпіскай звыш 6.000 членаў саюзу. Асабліва дрэнна праведзена рэалізацыя на саюзе будаўнікоў, дзе не ахоплена звыш 2.000 чалавек, нархарч — 940 чал., работнікаў асьветы — 770 чалавек, швэйнікаў — 265, савецкіх і гандлёвых служачых — 265, мэдсанпрацы—235 чал. Нізкая прафэсыянальныя арганізацыі і камісіі садзейнасьці не аддаюць належнай увагі поўнаму ахопу падпіскай членаў саюзу.

Грубае парушэньне правіл укладаў

Чэкі—замест наяўных грошай

3-я ашчадкаса пры Менскай паштова-тэлеграфнай канторы дапусьціла поўнае парушэньне правіл выдачы ўкладаў, выдаўшы ўкладчыку замест грошай чэкі на дзяржаўны банк.

Гэта пытаньне абмяркоўвалася на аб'яднаным пасяджэньні прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б і калегіі НК РСІ БССР. Калегія адзначыла, што выдача чэкаў на дзяржбанк замест наяўных грошай пры поўнай магчымасьці выдаць грошы зьяўляецца дыскрэдытацыяй ашчаднай справы і падрывае давер'е да яе з боку шырокіх мас укладчыкаў.

Загадчыку 3-й ашчадкасы КЭТЛЕРУ і касіру ГУЗУ абвешчана суровая вымова з папярэджаньнем.

Адначасова аб'яднанае пасяджэньне адзначыла, што кіраўніцтва Менскай паштова-тэлеграфнай канторы ня выконвае дырэктывы аб бесьперабойным і па-зачарговым здавальненьні ашчадкас наяўнымі грашыма.

МЕНСК

Абсьледваньне гомельскай арганізацыі МОПР'у

ЦК МОПР'у БССР прыступіў да абсьледваньня Гомельскай гарадской арганізацыі МОПР'у. Абсьледваньне праводзіцца інструктарам ЦК МОПР'у разам з брыгадай гомельскіх актывістаў. У першую чаргу будуць абсьледаваны ячэйкі МОПР'у буйнейшых прадпрыемстваў Гомелю.

Пабудова цырку

У Менск прыехаў прадстаўнік Цэнтральнага кіраўніцтва дзяржцыркамі тав. Мілавідаў для перагаворaў з мясцовымі арганізацыямі аб пабудове ў Менску капітальнага цырку - кінатэатру.

Прэзыдыум гарсавету згадзіўся з прапановай кіраўніцтва Дзяржцыркамі аб пабудове такога цырку. 50 проц. кошту пабудовы бярэ на сабе кіраўніцтва Дзяржцыркамі. Наркамасьветы вылучыў на пабудову цырку ў 1931 г. 550.000 руб.

Прэзыдыум гарсавету даручыў Наркамасу, Гарплану і Наркамасьветы ў дэкадны тэрмін вызначыць вучастак пабудовы.

Падрыхтоўка зоатэхнікаў

Окана БССР прапанавала Наркамзему правесьці ў бягучым годзе датэрміновы выпуск зоатэхнікаў. Апрача гэтага НКЗ даручана арганізаваць кароткатэрміновыя курсы па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы зоатэхнікаў нізэйшай кваліфікацыі.

Падрыхтоўка да ленінскіх дзён

Рабочкомы саюзу транспартнікаў разгарнулі падрыхтоўку да ленінскіх дзён. Па калектывах грузчыкаў і возчыкаў праводзяцца гутарыі і даклады аб жыцьці і дзейнасьці У. І. Леніна. Вядзецца работа па дадатковай падпісцы на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады».

Абнаўляюцца і абсталёўваюцца ленінскія кутні.

Наладжваюцца экскурсіі рабочых у музэй рэвалюцыі. Бібліятэкі папаўняюцца палітычнай і мастацкай літаратурай аб жыцьці і дзейнасьці Леніна і аб падзеях 9-га студзеня 1905 г.

21 і 22 студзеня адбудуцца жалобныя вечары, прысьвечаныя памяці Леніна.

Паведамленьні

СЕНЬНЯ:

— **Менскі архітэктурна-будаўнічы тэхнікум.** У 16 гадз., у пам. тэхнікуму— агульны сход. Парадак дня: 1. Абгаварэньне калдагавору на 1931 г.; 2. Даклад дырэктара тэхнікуму аб выніках акадэмпрацы за 1 семестр. 3. Бягучыя справы.

— **Дом Камасьветы.** У 19 гадз.—групавая кансультацыя для выкладчыкаў палітэканоміі ў ВСПШ—«Выкладаньне палітэканоміі і ўнязка з сучаснасьцю». Ад 19-21 гадз.—індывідуальная кансультацыя па палітэканоміі і эканомпалітыцы, па эканомгеаграфіі і запыткі гуртку нямецкай мовы.

— **Дом Асьветы.** У 19 гадз.—агульнагарадзкі сход асьветнікаў. Даклад аб рэвалюцыі 1905 г.

— **Пушкінская бібліятэка.** У 19 з пал. гадз. у пам. бібліятэкі, Кастрычніцкая вул., № 5, 2-гі паверх,—пасяджэньне бібліятэчнага савету. Яўка членаў бібсавету абавязкова. Запрашаюцца бібліятэкары і чытачы.

— **Навуковая асацыяцыя.** У 19 гадз., у пам. фізыялёгічнага інстытуту медыка-біялёгічная секцыя склікае чарговы сход. Парадак дня: 1) Даклад Лябедзіна «Узаемаадносіны антагеніі і філёгеніі і біягенэтычны закон». 2) Даклад Розанава «Уплыў дражджэй на рост пацукоў».

ЗАЎТРА:

— **Дом Пісьменьніка.** У 19 гадз.—пасяджэньне сэкцыі літаратуразнаўцаў-марксыстаў. У парадку дня—даклад т. Сэрбэнта—«Аб асноўных этапах гісторыі Беларусі». Прысутнасьць членаў т-ва і асьпірантаў-літаратуразнаўцаў абавязкова. Запрашаюцца студэнты літ. адд. і выкладчыкі беларускай літаратуры. Уваход вольны.

— **Дом Асьветы.** У 19 гадз.—сход тэхпрацаўнікоў—членаў саюзу працасьветы разам з утрыманцамі членаў саюзу. Даклад аб рэвалюцыі 1905 г.

— **Бюро скаргаў НК РСІ** 16-1-31 г. у 19 гадз., у пам. НК РСІ (Савецкая, 65, 2-гі паверх, пак. № 9)—нарада рабочых асяседзелых пры бюро скаргаў НК РСІ. Яўка абавязкова.

—**Партканцэлярыя ЦКК КП(б)Б** уносіць наступныя зьмены на выкліках апошнюючых на ПТ ЦКК УсеКП(б).

Акрамя выкліканых раней т. т. на 16, 17, 18, 19, 20 студзеня а 10 гадз. раніцы **выклікаюцца наступныя т. т.** у зьвязку раней абвешчаных ім тэрмінаў:

НА 16-1-1931 г. Кулеш Г. Ф., Масавіч В. А., Давыдаў П. Р., Сабіла С. М., Цяўлоўскі К. І., Эпштэйн М. Н., Белы А., Фэйгельман Я. Л., Кантаровіч С. З., Панасевіч Ул. Л., Гаралік Б. М., Сурэмчін Н. М., Гурскі А. Я., Татарыцкі П. А., Гітлін З. Х.

НА 17-1 31 г. Зльянаў С. Ф., Лапіцкі С. Н., Сідаранка П. І., Федарэнчык Я. С., Сташэўскі К. Н., Цузкевіч, Ул. І., Шыраеў А. Н., Магідаў А. С., Гранчык Р. А., Давідовіч Д. Я., Худзевіч П. А., Радневіч І. С., Вараб'ёў Т. Я., Маркін Б. С., Русіновіч П. У.

НА 18-1 31 г. Бураноў М. У., Сьняжкоў А. А., Бараша П. С., Цырлін Л. А., Навіцкі А. П., Федасеяў І. А., Шэніман І. Ш., Гірашчанка І. М., Шэйнман І. У., Дворкін Я. М., Робак А. А., Галкін Е. Ф., Сьпеван М. А., Малева М. М., Костка Н. У.

НА 19-1 31 г. Дубнэль Д. А., Корба С. Р., Герасімаў М. М., Раўнейка П. С., Бабіч Ф. Дз., Астапенка П. А., Гурло Ульф Е., Белавусаў Д. І., Ананеніч Р. Н., Гольдзін М. Я., Баркоўскі Ул. А., Суворaў М. М., Рэпкавец С. В., Грычэнка Я. Ц.

НА 20-1 31 г. Грыбоўскі Я. Х., Паўлаў П. Дз., Корсак М. І., Біркін Б. М., Даніленка Я. І., Герасіменка Я. Д., Мінкоў Ю. З., Брущкоў А. Р., Кохан А. А., Вялеска У. А., Юрэвіч У. Я., Красноў П. М., Сідзельнік А. Р., Чупраноў П. Л., Куцінаў М. Л., Дземчанка І. Г., Ермакоў І. П., Зопаталёка.

Усе выдаткі—за асабістыя кошт апэлюючых.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і галоўная контора Менск, Савецкая, 63.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	13-80	Мачны рэдактар	6-42
Сакратар	10-74	Галоўная контора	7-81
Сэктар інфармацыі	6-19	Аддзел падпіскі	7-81
		„ абвестак	7-81

Умовы падпіскі
(з дыркоўным дапатнам „Прафрук")

На 1 мес.	—	1 р.
„ 3 мес.	—	3 „
„ 6 мес.	—	6 „
„ 12 мес.	—	12 „

Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

Плата за абвесткі:
За радок (шэсьць пасьля тэксту—30 к., іншая гарадзкая абвестка—1 р. за радок. Пасьлядок тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Зьмест тэксту, згодна пастановы СНК ад 16-IX—24 г. абкладае 10 проц. падатку.

Абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газэты „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая 63, 2-гі паверх, тэл. 7-81.

ЗАЎЧОРА АДКРЫЎСЯ
БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ АСЬПІРАНТУРЫ

Контр-рэвалюцыйных „вучоных"-нацдэмаў з посьпехам заменяць новыя батальёны пралетарскіх спэцыялістаў,—каменшчыкаў сацыялістычнай будоўлі

Агульная заля Беларускай Акадэміі Навук.

Сьцены ўпрыгожаны лёзунгамі:

«Выгнаім нацыянал-дэмакратаў і ўсіх шкоднікаў, заменім іх новымі батальёнамі пралетарскіх спэцыялістаў».

«Перавтаварыць Акадэмію ў цэнтр пралетарскай навукі».

«Супроць агентаў ілясавага ворага—правых, «левых» і нацдэмаў».

У 8 гадзіне намесьнік прэзыдэнта ВАН т. **Шчарбакоў** адкрывае ўрачысты сход.

— Самы факт утварэньня інстытуту асьпірантуры, — гаворыць т. Шчарбакоў, — сьведчыць аб нашых вялікарных дасягненьнях і перамогах на фронце культурнага будаўніцтва. Але іменна на гэтым фронце мы мелі дні прарываў. Адкрыцьцё інстытуту супадае з вельмі адказнай старонкай у жыцьці і дзейнасьці ВАН, тай самай ВАН, якая на працягу гадоў зьяўлялася цытаделлю контр-рэвалюцыйных беларускіх нацыянал-дэмакратаў.

Назбавіцца спадчыны шкодніцкай работы нацдэмаў — неадкладная задача інстытуту асьпірантуры.

У прэзыдыум аднагалосна выбіраюцца: т.т. **Чарнушэвіч** (ЦК КП(б)Б), **Кавальчук** (гарком КП(б)Б), **Шчарбакоў, Рыўлін, Матулайціс, Клявіцкі, Колас** (прэзыдыум ВАН), **Серафімаў** (сэкцыя навуковых работнікаў), **Сэрбэнта** (інстытут гісторыі партыі), **Каранеўскі** (БДУ).

Дырэктар інстытуту асьпірантуры тав. **Рыўлін** азнаёміў прысутных са становішчам інстытуту да моманту яго адкрыцьця.

— Адкрыцьцём інстытуту асьпірантуры БАН, — сказаў т. Рыўлін, — мы завяршаем пэўны этап культурнага будаўніцтва у БССР. У той час, калі ў нас цяпер існуе 12 ВНУ, мы будуем найвышэйшую навучальную установу, куэлю «кадраў для кадраў». У інстытуце зараз налічваецца 119 асьпірантаў, з іх 26 рабочых, 46 сялян, 18 служачых і 20 інш. Па партыйнасьці яны падзяляюцца так: 77 партыйцаў, 17 камсамольцаў і 16 беспартыйных.

У сваёй практычнай рабоце новы інстытут павінен будзе даказаць, што ён, як і інстытут чырвонай прафэсуры ў Маскве, наперакор прадказаньням буржуазных «жрацоў» ад навукі, здольны выкоўваць прафэсараў з рабочых, сапраўды пралетарскіх, высока-кваліфікаваных спэцыялістаў.

Тав. **Чарнушэвіч** вітаў адкрыцьцё інстытуту ад імя ЦК КП(б)Б.

Перш за ўсё ён спыніўся на вялізарных гаспадарча-палітычных задачах, што стаіць перад партыяй і рабочай клясай у трэцім, рашаючым годзе пяцігодкі. Кантрольныя лічбы гэтага году, рост народнага прыбытку на 39 проц. і г. д., — гаворыць т. Чарнушэвіч, — сьведчаць аб тэмпах перавыкананьня намечанага пяцігадовага пляну, аб тэмпах, якіх ня ведае ніводная капіталістычная краіна сьвету, нават у часе свайго «росквіту».

Нам трэба шчыльна ўвязаць тэарэтычную навуковую работу з ажыцьцяўленьнем канкрэтных задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Новыя атрады чырвоных кадраў, што будуць выхтавацца ў сьценах інстытуту асьпірантуры, павінны быць бальшавіцкімі, ударнымі атрадамі ў барацьбе за генэральную лінію нашай партыі, у барацьбе за сацыялізм.

Потым з прывітаньнямі выступілі: ад імя Менскага гаркому КП(б)Б — т. **Навальчук**, ад імя інстытуту гісторыі партыі і таварыства гісторыкаў-марксыстаў — т. **Сэрбэнта**, ад імя кіраўніцтва БДУ — т. **Каранеўскі**, ад імя нац. сэктараў ВАН—т. **Агульнік**, ад імя катэдры марксызму-ленінізму і таварыства ваяўнічых дыялектыкаў — т. **Клявіцкі** і ад імя ЦБ сэкцыі навуковых работнікаў — т. **Серафімаў**.

Адказаў на прывітаньні прадстаўнік асьпірантуры інстытуту т. **Мальцар**.

Ад імя сходу паслана прывітаньне **Цэнтральнаму Камітэту КП(б)Б.**

— Адчыненьне інстытуту асьпірантуры, — гаворыцца у гэтым прывітаньні, — інстытуту для падрыхтоўкі кадраў для кадраў, якое стала магчымым толькі на базе вялізарнейшых культурных дасягненьняў, якія ёсьць у БССР, самае зьяўленьне новай буйнейшай перамогай на культурным фронце.

Асьпіранты і іх кіраўнікі запэўніваюць ЦК, што яны будуць працаваць бадзёрымі тэмпамі, па-ўдарнаму, што яны зробяць усё для таго, каб інстытут даваў нашай краіне новыя кадры навуковых работнікаў, якія аўладаюць марксыцка-ленінскім мэтадам, здольных зьвязваць ленінскую тэорыю з практыкай барацьбы за сацыялізм, за генэральную лінію партыі, непрымірымых барацьбітоў за ленінскую нацыянальную палітыку, барацьбітоў за ленінскую навуку.

Прывітаньне паслана таксама **інстытуту чырвонай прафэсуры**, які гэтымі днямі сьвяткуе свой дзесяцігадовы юбілей.

Юр. Л—ны.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
1. ВОСТРАЎ БЕГЛЯКОЎ драма ў 6 частках.
2. Глядзі ў корань кіно-фэльетон.
3. Замежны гукавы кіно-фільм ЧЭМПІЁНЫ ПЛАВАНЬНЯ
Пачатак 7 г., 8 г. 45 м. і 10 г. 30 м. Каса—з 5 гадз. веч.

Кіно-тэатр „Культура"
Лепшы фільм сэзону з эпохі грамадзянскай вайны
ТАБЕ ДАРУ
драма ў 6 разьдзелах.
Кіно-хроніка „Саюзкіно" № 64.
Пачатак у 7 г., 8 г. 40 м. і 10 г. 20 м. Каса—з 5 гадз.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
Цікавы фільм паводле аповядання знаменитага Шолам-Алейхема
ЯЎРЭЙСКАЕ ШЧАСЬЦЕ
— ЗВЫШ ПРАГРАМЫ — часопісь „Саюзкіно" № 63.
Пачатак 1-га сэансу—6 гадз. Каса—з 4 гадз. 30 м.

КІНО „Пралетары"
Амэрыканскі прыгодніцкі фільм
ЧОРНЫ ЦЫКЛЁН
Пачатак: 6 г., 7 г. 30 м., 9 г., 10 г. 30 м. Каса—з 4 з пал. гадз.

КІНО „Юны Піянэр"
Апошняя сарыя „ЧЫРВОНЫЯ Д'ЯВАЛЯТА"
кіно-аповесьць у 6 част.
Пачатак: 1 гадз., 2 гадз. і 3 гадз. дня. Каса адкрыта з 12 г. дня.

КІНО „Спартак"
Звыш праграмы гастроль арт. ленінгр. тэатру С. М. КОРЖЫНА — на экране —
ПАЛАЧЫ
у 7 частках з пралёгам.
Пачатак 7 г., 9, 11 гадз. Каса—з 5 гадзін.

Адкрыта падпіска на ЛЮТЫ і да канца 1931 г. на газэту „РАБСЕЛЬКОР"
Орган Культпропу ЦК КП(б)Б, выданьне газ. «Зьвязда».
Кожны рабкор, селькор, ваенкор і юнкор, рэдакцыйна-газэтны работнік, партыйна і прафсаюзна кіраўнічы работнік павінен чытаць, выпісваць і распаўсюджваць газ. „РАБСЕЛЬКОР".
„РАБСЕЛЬКОР"—центральная кіраўнічая газэта рабселькораў, ваенкораў і юнкораў БССР.
ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ПЯЦІДНЕЎКУ.
Падпісная плата: на 1 мес.—20 кап., на 6 мес.—1 руб. 20 кап., „ 3 мес.—60 кап., „ 1 год—2 руб. 40 кап.
Падпіска прымаецца ўсімі паштова-тэлегр. аддзяленьнямі і лістаносцамі.

У выпадку незкуратнага атрыманьня газэты ЗВАНЕЦЕ па тэлеф. № 15-42

БЕЛСАЎГАСТРЭСТАМ
з 1 лютага г. г. у г. Горках пры сельска-гаспадарчай акадэміі адкрываецца
4-Х МЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ ДЫРЭКТАРОЎ САЎГАСАЎ
УМОВЫ ПРЫЁМУ: На курсы прымаюцца члены КП(б)Б, якія маюць ня менш 2-хгадовага стажу рабфанаў ці акруговай кіруючай працы, элементарна граматныя (веданьне 4-дзесяцічнай арытметыкі абавязкова), пажадана знаёмства з сельскай гаспадаркай. Т. т., якія жадаюць паступіць, павінны да 20 студзеня падаць заявы ў адпаведны райком КП(б)Б.
СТЫПЭНДЫІ КУРСАНТАМ: нежанатым—100 руб. у месяц, з сям'ёй да 3-х едакоў—125 руб., з сям'ёй больш 3-х едакоў—150 руб.

БЕЛКААПСАЮЗУ ПАТРАБУЮЦЦА РУХАВІКІ 5-20 кон. сіл.
Прапановы накіроўваць па адрасе: Менск, Савецкая, 43-13, Белкаапсаюз, Культсэктар.

КУЛЬТПРОП МЕНГАРКОМУ КП(б) Б паведамляе ўсіх слухачоў першапачатковай партыйнай школы і саўпартшколы аб тым, што
ЗАНЯТКІ Ў ПАРТЫЙНЫХ ШКОЛАХ пачнуцца 18-га студзеня 1931 году.
Яўка ўсіх слухачоў у старыя памяшканьні ў 7 гадз. веч. абавязкова. Будзе рэгістрацыя.

16-га студзеня 1931 г. роўна ў 6 гадз. веч. у залі пасяджэньняў Менгаркому КП(б)Б (Энгельса, 28, 3-ці паверх) склікаецца
нарада сакратароў ячэек КП(б)Б, кіраўнікоў сэктараў росту партыі г. МЕНСКУ
з наступным парадкам дня: 1) Аб перавыбарах гарсавету. 2) Аб ходзе вярбоўкі рабочых у партыю. Яўка абавязкова.

Канторы выдавецтва «ЗЬВЯЗДЫ» ПАТРЭБНА МАШЫНІСТКА, якая добра ведае беларускую мову.
Звяртацца да загадчыка выдавецтва з 10—3 гадз. Савецкая, 63, 3-ці паверх.

ПРАЎЛЕНЬНЕ МЦРК ЗАПРАШАЕ на пастаянную работу інжынэраў-будаўнікоў, тэхнікаў-будаўнікоў, дзесятнікаў.
— АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ. —
Прапановы накіроўваць вусна або пісьмова будаўнічаму аддзелу МЦРК (Савецкая, 43, 1-ы паверх) тэл. 12-81).

Усім ячэйкам КП(б)Б г. Менску.
Гарком КП(б)Б прапануе на чарговых сходах ячэек КП(б)Б 17-I—31 г.
абгаварыць вынікі справаздачна-перавыбарчай кампаніі гарсавету (па прадпрыемствах—установах) і задачы перавыбараў.

Кошт публікацыі аб згубе 1 р. 1 дакумэнту

Праўленьне менскай арцелі краўцоў «ПРАЛЕТАРЫ» (Ленінская, 20, тэл. № 7-79)
паведамляе ўсе прадпрыемствы і ўстановы, што арцелі прымаюцца ўсякія буйныя заказы з матар'ялу заказчыка
па наступных пошах: мужчынскім, жаночым, плашчым, спэцвопратэ, скураных куртках, бялізны, дзіцячым, коўдрасьці, шапачным і пашыву ліўным.

Падпісайцеся на люты і далейшыя м-цы 1931 г. на газ. „ЗЬВЯЗДА"
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА на 1 месяц—1 руб.
З 1-I—31 г. газэта ВЫХОДЗІЦЬ БЕСЬПЕРАПЫННА
Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

15-га студзеня, у 7 гадз. увечары ў памяшканьні радакцыі газэты «РАБСЕЛЬКОР» (Савецкая вул. № 63, трэці паверх)
склікаецца НАРАДА
прадстаўнікоў Культсэктару ЦСПСБ, ЦК саюзаў, Белдзяржкіно, Белкаапсаюзу, мясцовых аддзелаў цэнтральных газэт, прадстаўнікоў радкалегій менскіх шматтыражак і усіх фота-аматараў менскіх прадпрыемстваў па пытаньні
„Фота-здымак на службу сацыялістычнаму будаўніцтву"
Радакцыя газэты «Рабселькор».

15-га студзеня—канфэрэнцыя чытачоў „ПРАВДЫ"
15-га студзеня, у 7 гадз. веч. у клубе Карла Маркса адбудзецца
Менская агульнагарадзкая канфэрэнцыя чытачоў „Правды"
З дакладам аб рабоце «Правды» выступіць загадчык аддзелу мясцовай сеткі і ўдарных брыгад тав. Ушарэвіча.
Пасьля канфэрэнцыі—мастацкая частка.
Партыйныя ячэйкі, фабкомы і рэдкалегіі газэт атрымліваюць білеты ў культпропе гаркому партыі і ў прадстаўніцтве «Правды» (Савецкая, 61).

Згубленыя і украдзеныя дакумэнты
лічыць несапраўднымі

Пасьв. аб скас. шл. Вял.-Сьліўск. с.-с. Грытавa А. Я., 3537; дав. аб пр. Мен. пажкам., бірж. карт. Мен. бірж. пр. Раева М. С., 3538-3539; чырв. арм. пасьв. 39 кав. п. Саламатава Г. Я., 3540; канд. карт. № 1359 Пух. РК ЛКСМБ, пасьв. аб сканч. Курасоўшч. с.-г. пш., пасьв. аб сканч. курс. сыравар., час. пасьв. аб сканч. Мар.-Горск. сад.-гар. тэхн. Рабіновіча Л. М., 3541-3544; орд. на пак. Жылст. Літвіноўскай Г. Я